**Лекции История (отечественная и всеобщая)**

## Тэма 1 Брытанія ў Раннім сярэднявеччы

*1. Германская экспансія ў Брытанію.*
*2. Брытанія ў перыяд гептархіі.*
*3. Сацыяльнга-эканамічнае развіццё і дзяржаўны лад.*
*4. Нарманская экспансія ў Брытанію.*

### 1. Германская экспансія ў Брытанію.

Брытанія напачатку сярэднявечча. Узровень раманізацыі Брытаніі. Гарады Брытаніі. Вывыд рымскіх легіёнаў у Галію напачатку ст. Нападзенні піктаў і скотаў. Запрашэнне ў Брытанію саксонскіх дружын Генгіста і Горсы. Экспансія ў Брытанію саксаў, англаў, ютаў і фрызаў. Выцясненне значнай часткі брытаў ва Ўэльс і на паўвостраў Арморыку. Стварэнне англа-саксонскіх дзяржаў. Дзяржавы брытаў. Далрыяда.

### 2. Брытанія ў перыяд гептархіі.

Тэрмін "гептархія". Стварэнне Кента ў канцы VI ст. Узвышэнне Кента напачатку VII ст. пры Этэльберце. Стварэнне першага англасаксонскага зводу законаў. Хрысціянізацыя Кента пры Этэльберце рымскімі місіянерамі. Падпарадкаванне Кенту Ўсходняй Англіі. Прыняццё каралём Усходняй Англіі Рэдвальдам хрысціянства.

Барацьба за гегемонію паміж Нартумбрыяй і Мерсіяй. Аб'яднанне Берніцыі і Дэйры і стварэнне Нартумбрыі. Спробы хрысціянізацыі Нартумбрыі Эдвінам у першай палове VII ст. Узвышэнне Нартумбрыі пры Эдвіне. Барацьба супраць Нартумбрыі кааліцыі Гвінеда і Мерсіі. Разгром і смерць Эдвіна англамі Мерсіі і брытамі Гвінеда ў 632 г. Узвышэнне Мерсіі пры Пендзе ў 30-50-х гг. VII ст. Падпарадкаванне Мерсіяй Сярэдняй Англіі. Узвышэнне Нартумбрыі пры Освальду ў сярэдзіне VII ст. Хрысціянізацыя Нартумбрыі ірландскімі манахамі. Новае сутыкненне Нартумбрыі з Мерсіяй, забойства Освальда. Падпарадкаванне Пендай Уэсэкса і Ўсходняй Англіі. Паход Пенды на Нартумбрыю ў 655 г. і забойства Пенды, пераход гегемоніі да Нартумбрыі.

Узвышэнне Нартумбрыі пры Освi (642-670 гг.). Прыняцце Освi тытула брэтвальды. Хрысціянізацыя Мерсіі ірландскімі місіянерамі ў другой палове VII ст. Чарговае ўзвышэнне Мерсіі ў канцы VII ст.

Гегемонія Мерсіі ў VIII ст. Мерсія падчас праўлення караля Офы (757-796 гг.). Узвышэнне Ўэсэкса пры Эгберце ў першай трэці IX ст. Падпарадкаванне Ўэсэксам Кента, Эсэкса, Мерсіі, часткі Ўэльса, намінальная залежнасць Нартумбрыі. Незалежнасць захавала Ўсходняя Англія і магчыма Сасэкс. Прыняццё Эгбертам тытула брэтвальды. Распад дзяржавы Эгбеота пасля яго смерці ў 839 г. і вяртанне гегемоніі да Мерсіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**3. Сацыяльнга-эканамічнае развіццё і дзяржаўны лад.**
Расяленне англасаксаў. Сумеснае пражывыанне англасаксаў і брытаў. Сацыяльны лад. Рабы, лэты, уілі, кэрлы, гезіты, эльдармэны. Гайда. Фольклэнд і боклэнд. Глафорды. Пачатак запрыгоньвання кэрлаў. Глафорды. Грамадскі лад англасаксаў. Гемот. Уітэнагемот. Скіры. Элдармэны і скіра-герыфы.

**4. Нарманская экспансія ў Брытанію.**
Першыя рэйды данаў і нарвежцаў у Брытанію (793 і 795 гг.). Спробы караля Мерсіі Офы і франкскага караля Карла вялікага арганізаваць абарону ўзбярэжжа. Удалая абарога Уэсэкса Эгбертам. Разгром Эгбертам арміі брытаў і нарвежцаў ў 838 г. Разарэнне ўзбярэжжа Нартумбрыі. Разбурэнне данамі Лондана ў 842 г. Змена характару экспансіі вікінгаў у сярэдзіне IX ст. Першая зімоўка вікінгаў у Англіі ў 851-852 гг. Нападзенне ў 865 г. "Вялікай арміі" вікінгаў. Захоп данамі Усходняй Англіі ў 865 г. Падпарадкаванне Нартумбрыі ў 866 г. Разарэнне Мерсіі ў 868 г. Захоп палітычнай ўлады данамі ў Нартумбрыі, Мерсіі і Ўсходняй Англіі ў 870-х гг. Раздача зямель данам.
Аб'яднанне англасаксонскіх дзяржаў вакол Уэсэкса. Барацьба Альфрэда з данамі, дагавор 879 г. і падзел Брытаніі на Ўэсэкс і Дэнло (Данэлаг). Сацыяльныя і этнічныя працэсы ў Дэнло.Рэформы Альфрэда Вялікага (871-899 гг.): фірд, тэны, бургі, "дацкія грошы". Вызваленне Лондана ў 886 г. Наступленне англасаксаў у X ст. Далучэнне да Ўэсэкса Мерсіі Эдуардам Старым (900-924 гг.). Барацьба Эдуарда са скотамі, брытамі і ірландскімі нарманамі. Ліквідацыя каралём Этэльстанам Дэнло і аб'яднанне пад яго ўладай усёй англасаксонскай Брытаніі. Прыняццё тытула брэтвальда. Прыняццё Эдгарам у 973 г. тытула "караля англічан".

**Тэма 2 Варварскія дзяржавы на Пірэнеях і ў Афрыцы.**

*1. Афармленне вестгоцкай дзяржаўнасці ў Тулузе.*
*2. Таледскае каралеўства вестготаў.*
*3. Каралеўства свеваў.*
*4. Алана-вандальскае каралеўства.*

**1. Афармленне вестгоцкай дзяржаўнасці ў Тулузе.**
З'яўленне вестготаў на чале з Атаульфам у Галіі і ўтварэнне Вестгоцкай дзяржавы з цэнтрам ў Тулузе. Узеаемаадносіны паміж вестготамі і рымлянамі. Суадносіны вестгоцкага і гала-рымскага насельніцтва. Тэадорых II. Бітва на Каталаўнскіх палях 451 г.
Праўленне Эйрыха II. Кадыфікацыя вестгоцкага права ў 475 г. Заваяванне вестготамі Іспаніі (468-475 гг.). Падпарадкаванне свеваў і страта кантроля над імі.
Праўленне Аларыха II – росквіт і крах Тулузскага каралеўства вестготаў. Кадыфікацыя вестгоцкага права для рымлян ("Брэвіярый Аларыха", 506 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

З’яўленне франкскай пагрозы. Франка-вестгоцкая вайна 507-512 гг. Бітва каля Пуацье 507 г. Бітва каля Барселоны 512 г. Барацьба за ўладу паміж Гезаліхам і Амаларыхам, умяшанне остготаў.

**2. Таледскае каралеўства вестготаў.**

Адраджэнне рэальнага суверэнітэту Амаларыхам у 526 г. Разгром франкаў у бітве каля Сарагосы 532 г. Узмацненне каралеўскай улады пры Амаларыху. Афармленне структуры кіравання каралеўствам (дуксы, каміты, вікарыі).

Заканчэнне дынастыі Балтаў у 531 г., вяртанне да выбарнага прынцыпу апрызначэння манарха. Рост пагрозы з боку Візантыі ў сярэдзіне VI ст. Захоп візантыйцамі Бетыкі ў 551 г.

Праўленне Леавігільда (568-586 гг.), як спроба ўніфікацыі грамадства Вестгоцкай дзяржаве на базе арыянства. Барацьба паміж Леавігільдам і Герменгільдам (579-585 гг.). Заваяванне каралеўства свеваў. Букцэлярыі. Пачатак феадалізацыі і фарміраванне бенефіцыяльнай сістэмы. Паўстанне Герменгільда. Прыняццё хрысціянства паводле рымскага ўзору. Уварванне арабаў і падзенне Вестгоцкай дзяржавы.

**3. Каралеўства свеваў.**

З’яўленне свеваў на Пірэнейскім праўвостраве ў 409 г. Пагадненне паміж рымскімі ўладамі і свевамі ў 411 г. і рассяленне ў Галісіі. Утварэнне каралеўства свеваў на паўночным захадзе паўвострава. Зыход вандалаў у Афрыку ў 429 г. і спробы свеваў пашырыць свой уплыў у Іспаніі. Перамогі каралёў Рэхілы і Рэкіярна над баскамі і рымлянамі. Наступленне вестготаў Тэадорыха II і падзенне сваўскай дзяржавы ў 456 г. Паўстанне Агівульфа. Адраджэнне незалежнасці свеўскай дзяржавы Мальфам у 460-х гг. Актывізацыя знешнепалітычнай актыўнасці свеваў у 60-70-х гг. VI ст. Умяшальніцтва караля Міра ў міжусобную вайну ў Вестгоцкім каралеўстве. Спроба выйсці з-пад улады вестготаў караля Аўдэкі ў 583-585 гг. Захоп Свеўскай дзяржавы вестготамі ў 585 г.

Асаблівасці эканамічнага і палітычнага развіцця. Рэлігійная сітуацыя ў свеўскім грамадстве.

**4. Алана-вандальскае каралеўства.**

Асаблівасці племяннай арганізацыі вандалаў: сілінгі і асдзінгі. Пачатак руху вандалаў на рымскія землі пры Годагізэлю . Выбранне конунгам Гундэрыха і прарыў рымскай мяжы ў 406 г. Рассяленне вандалаў і аланаў у Іспаніі ў 409 г. Дагавор з ж рымскімі ўладамі 411 г. Паходы вестгоцкага караля Валія на вандалаў 416 і 418 г., знішчэнне значнай часткі сілінгаў.

Аб’яднанне сілінгаў, аланаў і асдзінгаў пад уладай Гейзерыха. Узвышэнне дзяржавы вандалаў пры Гейзерыху, заваяванне Паўночнай Афрыкі ў 429-435 гг. Алана-вандальскае каралеўства ў Афрыцы. Паўстанне родаплеменной знаці ў 442 г. і падаўленне яго Гейзерыхам. Захоп Сіцыліі ў 442 г. Захоп Гейзерыхам Рыма ў 455 г. Абвастрэнне рылігійнага пытанне ў дзяржаве вандалаў пры

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Хунэрыху. Змены ў рэлігійнай палітыцы пры Гунтамундзе. Войны вандалаў з Адаакрам. Збліжэнне вандалаў з остготамі пры Тразамундзе.
Аслабленне Вандальскага каралеўства напачатку VI ст., уварванні бербераў. Збліжэнне Хільдэрыха з Візантыяй і артадаксальнай царквой і яго звяржэнне ў 530 г. Вяртанне да праарыянскай і антывізантыйскай палітыкі, распад дзяржавы вандалаў. Візантыйска-вандальская вайна 532-534 гг. і захоп Вандальскага каралеўства Візантыяй.
Асаблівасці развіцця палітычнай структуры і сацыяльна-эканамічнага развіцця.

**Літаратура**


1. Дворецкая И. А. Западная Европа в V—IX вв. Раннее средневековье. - М., 1990.
2. Корсунский А. Р., Гюнтер Р. Упадок и гибель Западной Римской империи и возникновение германских королевств (до середины VI в.). – М., 1984.
3. Корсунский А. Р. Образование раннефеодального государства в Западной Европе. - М., 1963.


**ТЭМА 3 Візантыя ў V-IXст.**

*1. Фарміраванне Візантыйскай імперыі.*
*2. Палітычнае развіццё Візантыі ў V – першай паловеVI ст.*
*3. Палітычнае становішча Візантыі ў другой палове VI – першай трэці VII ст.*
*4. Візантыя ў барацьбе з арабскай экспансіяй. Іканаборчы рух.*

**1. Фарміраванне Візантыйскай імперыі.**
Утварэнне Візантыйскай імперыі. Тэрыторыя імперыі каля 1 млн. км$^2$ у IVст. Прыродна-кліматычныя ўмовы і этнічны склад насельніцтва. Рамеі.Дэмаграфічная сітуацыя ў IVст., 30-35 млн. чалавек.Стан гарадоў, роля Канстанцінопаля. Палітычнае і адміністрацыйнае ўладкаванне Візантыі. Васілеўс і яго статус у Візантыі. Лагафеты.Арыстакратыя, дымархі.
Сацыяльна-эканамічныя змены ў IV-VI ст. Мітракомія. Георгі, калоны, парыкі, рабы. Усходнехрысціянская царква ў ранняй Візантыі. Манаства. Ератычныя рухі. Арыяне, нестарыяне, манафізіты, манафеліты, паўлікіяне.
**2. Палітычнае развіццё Візантыі ў V – першай паловеVI ст.**
Асаблівасці палітычнага развіцця Візантыі. Праўленне імператара Аркадзя, выцесненне вестготаў. Стабілізацыя становішча пры Феадосію II, распаўсюджанне нестарыянства і манафізіцтва. Нашэсце гунаў. Унутрыпалітычны крызіс у 50-70-х гг. V ст. Імператар Зянон і яго палітыка. Паляпшэнне ўзаемаадносін паміж артадоксамі і манафізітамі, перанакіраванне остготаў у Італію. Паляпшэнне эканамічнай сітуацыі пра Анастсію I. Пераварот Юстына I і пачатак жорсткага пераследу манафізітаў.
Візантыя падчас праўлення ЮсцініянаI, “васілеўса, які ніколі не спіць”. Феадора. Палітычныя “партыі” ў Візантыі. Паўстанне “Ніка” 532 г..Рэформа

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

права, Кодэкс Юсцініяна. Вайна з вандаламі і падпарадкаванне паўночнага ўзбярэжжа Афрыкі. Вайна з остготамі і вызваленне Італіі. Велізарый і Нарсес. Прагматычная санкцыя. Вайна з вестготамі і захоп Бетыкі. Вайна з Сасанідскім Іранам. Гегемонія Візантыі ў Еўропе і эканамічны крызіс у краіне.

**3. Палітычнае становішча Візантыі ў другой палове VI – першай трэці VII ст.**

Пагаршэнне унутры і знешнепалітчнай сітуацыі пры спадчынніках Юсцініяна I – Юсціне II і Тыберыі II. Заняпад у сельскай гаспадарцы, павышэнне ролі дынатаў у палітыцы. Актывізацыя славян і протабалгар на паўночных межах Візантыі, а таксама стварэнне Лангабардскага каралеўства ў Паўночнай Італіі. Абвастрэнне ўзаемаадносін з Сасанідскім Іранам.

Маўрыкій і го спробы палепшыць становішча на міжнароднай арэне. Стварэнне Равенскага экзархату для барацьбы супраць лангабардаў у Італіі і Карфагнскага экзархату для абароны афрыканскіх зямель ад набегаў бербераў. Урэгуляванне канфлікта з Іранам. Паход на на славян імяцеж Фокі ў арміі. Забойства Маўрыкія і чарговы перыяд нестабільнасці ў імперыі і абвастрэння ўзаемадносін з Іранам.

Паўстанне Іраклія і звяржэнне Фокі. Стабілізацыя ўнутрыпалітычнага жыцця пры Іракліі, заснаванне дынастыі Іраклія. Увядзенне фемнага ладу. Стварэнне фем па ўзору рней створаных экзархатаў. Канцэнтрацыя ўлады ў фемах у руках ваеннай адміністрацыі – страцігаў. Фарміраванне сцыяльнага пласта стратыётаў. Вынік дзейнаці Іраклія – перамога ў барацьбе з Сасанідскім Іранам. Генезіс феадалізму ў VII-VIII ст.

**4. Візантыя ў барацьбе з арабскай экспансіяй. Іканаборчы рух.**

Пачатак “цёмных стагоддзяў” VII-VIII ст. З’яўленне арабскай пагрозы. Уварванне арабаў у Сірыю (634 г.). Бітва на р. Ярмук 636 г. і разгром арміі рамеяў арабамі. Імклівае пагаршэнне знешнепалітычнай сітуацыі ў Візантыі ў другой палове VII ст.Заваяванне арабамі Сірыі, Палесціны, Месапатаміі, Егіпта, узбярэжжа паўночнай Афрыкі. Візантыя ў VIII-IX ст. Захоп лангабардамі значнай часткі Італіі. Стварэнне на Балканах у 681 г. Першага Балгарскага царства, славянізацыя Далмацыі, Фракіі і Македоніі. Жорсткая ўнутрыпалітычная барацьба за ўладу. Арабская аблога Канстанцінопаля з мора ў 674-678 гг. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнай барацьбы на пчатку VIII ст.

Прыход да ўлады Льва III Ісаўра, заснаванне Ісаўрыйскай дынастыі. Пачатак іконаборчай палітыкі ў 726 г., пагаршэнне ўзаемаадносін дзяржавы і хрысціянскай царквы, але павелічэнне сродкаў для вядзення барацьбы супраць арабскай экспансіі. Мэты правядзення іконаборчага руху. Заключэнне візантыйска-хазарскага антыарабскага саюзу. Разгром арабаў у 740 г. у бітве каля Акроіна. Працяг іконаборчай палітыкі Канстанцінам V і Львом IV Хазарам. Паспяховая барацьба супраць арабаў. Крызіс ва ўзаемаадносінах паміж дзяржавай і царквой, выхад рымскіх біскупаў з-пад кантроля імператара, фарміравання на тэрыторыі візантыйскай Італіі (за выключэннем Апуліі, Калабрыі і Сіцыліі) Царкоўнай дзяржавы. Вяртанне да іконашанавання пры імператрыцы Ірыне, яе барацьба з сынам Канстанцінам V.

РЕПОЗИТОРИЙ ГРОДНО

Сацыяльна-эканамічныя змены ў часы праўлення Ісаўраў. “Эклога” 726 г. Фарміраванне візантыйскага феадалізму.Аграрны лад па звестках “Земляробчага закону”.Дынаты. Георгі, марціты, апоры, містыі. Адсутнасць заходнееўрапейскай іерархічнасці. Паступовае знікненне рабства.

Звяржэнне Ірыны Нікіфарам І, спробы барацьбы з балгарамі. Паражэнне ад балгар у Вырбішскім паходзе 811 г.. Прызнанне імператарам Міхаілам І Рангаве імператарскага тытула франкскага манарха Карла Вялікага і, як вынік, далучэнне Венецыі. Разгром візантыйцаў балгарамі ў 812 г. пад Версінікамі і дэтранізацыя Міхаіла.

Вяртанне да іконаборчай палітыкі Львом V Армянінам. Перамір'е з балгарамі. Стабілізацыя знешнепалітычнага становішча. Прыход да ўлады Міхаіла ІІ Траўла і заснаванне Амарыйскай дынастыі. Правядзенне памяркоўнай іконаборчай палітыкі. Паўстанне Фамы Славяніна.Узмацненне Візантыі пры імператары Феафіле. Падрымка ўзаемадносін з франкскімі імператарамі і хазарскімі каганамі, перамір’е з балгарамі далі магчымасць актыўнай барацьбе скпраць печанегаў і Багдадскага халіфату Абасідаў. Аднаўленне іконашанавання пры Міхаіле ІІІ і жорсткая барацьба з паўлікіянамі. Забойства Міхаіла – заканчэнне Амарыйскай дынастыі.

**Высновы:**

1. Візантыя з’яўлялася непасрэдным нашчадкам Рымскай імперыі, яна захавала назву (Рамейская імперыя), антычную сістэму кіравання (васілеўс, Сінкліт, лагафеты), заканадаўства, армію і многія іншыя рысы.
2. Да пачатку IX ст. Візантыя з’яўлялася адзінай імперыяй, прыярытэт якой на міжнароднай арэне прызнавалі ўсе суседнія еўрапейскія дзяржавы.
3. Візантыя не перажыла аграрызацыі і натуралізацыі гаспадаркі, працэсы дэзурбанізацыі ў раннім сярэднявеччы ў параўнанні з Заходняй Еўропай былі нязначнымі. Моцная дзяржаўная ўлада садзейнічала кансервацыі антычных рабаўладальніцкіх рысаў і запавольвала працэс развіцця феадальных адносін.
4. Жорсткая палітычная барацьба, якая была цесна звязана з рэлігійнымі спрэчкамі істотна аслабляла Візантыю на міжнароднай арэне перад нашэсцем славян, лагабардаў, персаў і арабаў.

**Літаратура**

1. Абрамов Д.М. Византия и её северные соседи I – VIII вв.: Очерки. Ч.1.- М., 2002.
2. Абрамов Д.М. Византия и её северные соседи VIII - XIII вв.: Очерки. Ч.2.- М., 2002.
3. История Византии. В 3 т. - М., 1967. Т. 1—3.
4. Курбатов Г. Л. История Византии (от античности к феодализму). - М., 1984.
5. Курбатов Г. Л. Ранневизантийские портреты. К истории общественно-политической мысли. – Л., 1991.
6. Удальцова З. В. Италия и Византия в VI веке. – М., 1959.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

7. Удальцова З. В. Идейно-политическая борьба в ранней Византии (по данным историков IV – VII вв.). – М., 1974.
8. Успенский Ф.И. История Византийской империи: VI – IX вв.- М., 1999.

**тэма 4 Візантыя ў 9 – пачатку 13 ст.**

1. Візантыя ў перыяд праўлення Македонскай дынастыі
2. Эпоха Камнінаў (1081-1180).
3. Чацвёрты крыжовы паход і стварэнне Лацінскай імперыі.

**1. Візантыя ў перыяд праўлення Македонскай дынастыі**

Падчас праўлення ў Візантыі імператара Міхаіла III адбылося ўзвышэнне аднаго з яго фаварытаў – Васіля Македаняніна. У 867 г. ён арганізаваў забойства імператара, захапіў уладу і заснаваў дынастыю, прадстаўнікі якой кіравалі Рамейскай імперыяй амаль два стагоддзі да 1056 г.

Васіль І распачаў актыўную дзейнасць па стабілізацыі грамадска-палітычнага жыцця пасля доўгага перыяду бескампраміснай унутрыпалітычнай барацьбы ў папярэдні перыяд. Было сістэматызавана рамейскае заканадаўства, упершыню была зроблена спроба заканадаўча вызначыць абавязкі васілеўса і патрыярах. Сур’ёзную ўвагу Васіль надаў паляпшэнню становішча візантыйскага войска. Колькасць арміі была павялічына, а заробак ваяроў павялічаны. Улічваючы небяспеку з боку арабаў Васіль І Македанянін (867-886) усталяваў добрыя ўзаемаадносіны з Германскім каралеўствам і папствам. У 869 г. па ініцыятыве Васіля І і папы рымскага Адрыяна ІІ у Канстанцінопалі адбыўся царкоўны сабор, які ў заходняй царкве дагэтуль лічыцца VIII Усяленскім.

Праўленне пераемніка Васіля - імператара Льва VI Філосафа (886-912) аказалася не настолькі ўдалым, як заснавальніка дынастыі. У 894 г. візантыйскае войска было разбіта балгарскім царом Сімеонам І, пасля чаго рамеям давялося выплочваць даніну свайму паўночнаму суседу. Непасрэдная пагроза навісла над італьянскімі ўладаннямі імперыі. Яшчэ з VI ст. у гэтым рэгіёне візантыйцы вялі барацьбу ў гэтым рэгіёне з лангабардамі, а з пачатку VIII ст. з Сіцылі візантыйцаў сталі выцесняць арабы. У 902 г. арабы захапілі апошнюю крэпасць у Сіцыліі Таўраменій. Крыт стаў апорпай базай арабскіх піратаў, адкуль яны здейснілі разбуральную атаку па Фесалонікі ў 911 г. Спроба Льва VI нанесці ўдар у адказ закончылася поўным правалам. Арганізаваная супраць арабаў ваенная экспедыцыя была разгромлена ў 912 г. каля Хіяса. У часы праўлення Льва VI адбыўся і паход рускага князя Алега на Візантыю, рэальнасць якога аспрэчваецца многімі навукоўцамі. Тым не менш, у 911 г. Леў VI залючыў з Алегам гандлёвы дагавор, які з’яўлееццa першай узгадкай аб Русі як дзяржаўным утварэнні. Не ўмацоўваў імперыю і канфлікт імператара з патрыярхам Мікалаем І Містыкам, які не хацеў вянчаць яго з Зояй карбонапсінай і, нават, адлучыў ад царквы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Смерць Льва VI аслабіла і без таго нетрывалыя пазіцыі Візантыі. Малагадовы імператар Канстанцін VII Парфірародны (913-959) сам кіраваць не мог, а яго суправіцель імператар Аляксандр хутка памёр. Рэгентам стаў патрыярх Мікалай I Містык. Барацьба за правы рэгента прывяла да таго, што ў 920 г. уладу захапіў друнгарый рамейскага флота, гетэрыярх Раман Лакапін, які ў 919 г. ажаніў маладога васілеўса на сваёй дачцэ, а ў 920 г. абвясціў сябе яго суправіцелем Раманам I (920-944). З мэтаю ўзмацнення імперыі праз падтрымку стратыётаў новы васілеўс у 922 г. пачаў барацьбу супраць дытатаў (зямельна-чыноўніцкай арыстакратыі). Для абароны сялянскага землеўладання Раман увёў пераважнае права сваякоў і суседзяў на пакупку адчужальнага маёнтка, абавязковы зварот зямель стратыётаў, якія ўжо былі набыты дынатамі, а таксама забараніў дынатам над усялякімі відамі набываць стратыёцкія землі. Гэтымі мерамі Раману I удалося стрымаць сацыяльна-эканамічны працэс паглынання дробнага землеўладальніцтва, якое з'яўлялася галоўнай крыніцай вайсковай і фінансавай сілы імперыі.

Нягледзячы на неаднаразовыя змовы з мэтаю вызваліць Канстанціна VII з-пад апекі Лакапінаў, палітычная сітуацыя ў Візантыі ў 20-40-х гг. X ст. была даволі стабільнай, што дазволіла Раману I дабіцца пэўных знешнепалітычных поспехаў. У супрацьстаянні з балгарамі сітуацыя паступова стала мяняцца на карысць імперыі. У 924 г., калі балгарская армія цара Сімеона з'явілася каля сцен Канстанцінопаля, Раману, нягледзячы на непрыемную для імператара сустрэчу, удалося пазбегнуць эскалацыі канфлікта. Пасля смерці Сімеона, улічваючы цяжкае становішча новага цара Пятра, Раману ўдалося яшчэ больш знізіць узровень напружанасці. У 927 г. Візантыя прызнала аўтакефалію балгарскай патрыярхіі, страту часткі Фракіі і пагадзілася на выплату штогадовай даніны.

У Італіі візантыйцы з цяжкасцямі, але ўсё ж стрымлівалі націск лангабардаў і арабаў, а венгры і печанегі сталі саюзнікамі рамеяў, што, праўда, не перашкаджала ім час ад часу нападаць на імперыю і прымушаць рамеяў адкупацца ад іх золатам.

Урэгуляванне ўзаемаадносін з суседзямі на еўрапейскай частцы імперыі дазволіла візантыйцам дабіцца сур'ёзных поспехаў на малаазіяцкім накірунку. Візантыйскі палкаводзец Ян Куркуас на працягу 920-942 гг. авалодаў больш чым 1000 крэпасцямі і адсунуў межы імперыі ад р. Галіс да Ефрата і Цігра. З-пад улады халіфата былі вызвалены армянскія і іверыйскія князі, якія сталі саюзнікамі імперыі на ўсходзе.

У сярэдзіне X ст. перад візантыйцамі навісла пагроза з боку Русі. У 941 г. князь Ігар, магчыма вымушаны хазарамі, здейсніў паход на Канстанцінопаль, але рамеі, флот якіх змагаўся супраць арабаў у Сіцыліі, у бітве каля Іерона дапамозе "грэчаскага агня" ўсё ж здолелі нанесці паражэнне русі. Ігару давялося вярнуцца ў Кіеў, але частка рускага войска засталася і на працягу лета 941 г. рабавала малаазіяцкае ўзбярэжжа Візантыі. Наступнік Феафана малюе наступную карціну:"Багата злачынстваў зрабілі русы да падыходу рамейскага войска: спалілі ўзбярэжжа Сцена (Басфора), а палонных адных распіналі на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

крыжы, іншых забівалі ў зямлю, трэціх ставілі мішэнямі і расстрэльвалі з лукаў. Пленным жа з святарскага стану яны звязалі за спінай рукі і забівалі ім ў галаву жалезныя цвікі. Шмат яны спалілі і святых храмаў”. З падыходам рамейскай арміі русы паспрабавалі ўцячы дадому, але 15 верасня іх флот быў знойдзены і знішчаны каля горада Кіла. У 943 г. рускі князь Ігар здзейсніў другі паход на Канстанцінопаль, але рамеі здолелі прадухіліць разгортванне баявых дзеянняў багатымі падарункамі. Ва ўзаемаадносінах з Рускай дзяржавай візантыйская дыпламатыя ўзяла курс на евангелізацыю і ў 957 г. хрышчэнне прыпяла ўдава Ігара княгіня Вольга, візантыйскія місіянеры пачалі актыўную прпаведзь на рускіх землях.
У 943 г. у Рамана І абвастрыліся адносіны з сынамі – суправіцелямі Канстанцінам і Стэфанам Лакапінамі, якія ў 944 г. звергլі яго і адправілі ў манастыр. Аднак у барацьбу ўсупіла сястра новых імператараў Алена, якая была замужам за найбольш легітымным з імператараў – Канстанцінам VII Парфірародным. Літаральна праз 40 дзён пасля звяржэння Рамана, Канстанцін і Стэфан Лакапіны былі звергнуты і накіраваны ў той жа манастыр, дзе знаходзіўся іх бацька, які сустрэў іх с пэўнай доляй іроніі. Такім чынам, пачалося рэальнае праўленне Канстанціна VII Парфірароднага, які быў абвешчаны імператарам яшчэ ў 920 г. Імперыя працягнула наступленне на ўсход, хаця значных поспехаў Канстанцін дасягнуць не здолеў, але яго сын імператар Раман ІІ Малодшы, дзякуючы намаганням палкаводца Нікіфара Фокі ў 961 г. авалодала Крытам, што забяспечыла Візантыі панаванне ва ўсходнім Міжземнамор’і. У 961 і 962 гг. былі адбіты нашэсці венграў, а ў 962 г. супраць сірыйскіх Хамданідаў была накіравана 100-тысячная армія на чале с Фокам. У самы разгар падзей Раман ІІ нечакана памёр, пакінуўшы малагадовых спадкаемцаў Канстанціна VIII і Васіля ІІ (вядомага пазней як “Балгарабойца”). Карыстаючыся гэтам, Нікіфар ІІ Фока ў сакавіку 963 г. абвясціў сябе імператарам (863-869).
Асновай палітыкі новага васілеўса стала імкненне да ўзмацнення ваеннай магутнасці імперыі. З гэтай мэтай ён у 964 г. забараніў заснаванне новых манастыроў і абмежаваў рост манастырскага землеўладання, што дазволіла ўмацовацца свецкаму землеўладанню і, такім чынам, павялічвалася матэрыяльная базу для арганізацыі катафрактаў (цяжкаўзброенай кавалерыі). Апроч таго, у тры разы быў павялічаны мінімальны памер стратыёцкага надзелу, такім чынам, стратыёты вылучыліся з астатняй масы сялянства ў асобы сацыяльны слой. Зробленыя захады дазволілі васілеўсу дасяглуць значных поспехаў на міжнароднай арэне. Ва ўсходнім накірунку візантыйцы здолелі адваяваць у арабаў у 965 г. Кілікію і Кіпр, а ў 969 г. захапіць Антыёхію ў Сірыі.
Удала для Візантыі складавалася супрацьстаянне з балгарамі. Для барацьбы з імі Нікіфар ІІ Фока ўступіў у саюз з рускім князем Святаславам, які ў 968 г. нанёс удар па Балгарыі з поўначы.
Яшчэ адным фронтам барацьбы стала суперніцтва з арабамі і германцамі за Паўднёвую Італію. У сярэдзіне ІХ ст. лангабардскае герцагства Беневента

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

прыйшло ў заняпад, што садзейнічала ўзмацненню ў регіёне германскага імператара Атона I на якога арыетаваўся лангабардскі герцаг Пандульф I. Калі ў змаганні з арабамі візантыйцам давялося саступіць, у 965 г. арабы авалодалі апошняй візантыйскай крэпасцю ў Сіцыліі, то ў барацьбе з лангабардамі рамеям пашанцавала болей. У 969 г. візантыйская армія ў бітве каля Бавіна разграміла лангабардаў.

Забойства Ніківара II Фокі ў снежні 969 г. не спыніла працэса ўзмацнення Візантыі. Прышоўшы да ўлады пляменнік папярэдняга васілеўса Ян I Цімісхій (969 976) ужо быў вядомым і дасведчаным палкаводцам. Хаця ён быў адным з арганізатараў дзяржаўнага перавароту, ён здолеў перанесці адказнасць за забойства Нікіфара на сваіх праціўнікаў і выдаліў іх з Канстанцінопаля. У 969 г. рускі князь Святаслаў, захапіў усходнюю частку Балгарыі, а затым напаў на Візантыю. Вясной 970 г. адбылася бітва каля Аркадыяполя, вынікі якой рамейскія і рускія крыніцы прадстаўляюць супрацьлеглым чынам. У любым выпадку, рускае войска спыніла наступленне на сталіцу імперыі, а рамейская армія была перакінута ў Малую Азію для падаўлення мецяжу Варды Фокі Малодшага. Пасля падаўлення мецяжа Ян Цымісхій асабіста ўзначаліў паход супраць русаў, якія былі блакіраваны ў Дарастоле. Пасля чатырохмесячных баёў у ліпені 971 г. Святаслаў быў вымушаны запрасіць міра і пакінуў Балгарыю, пасля чаго яе ўсходняя частка адыйшла да Візантыі. У барацьбе з арабамі Цымісхій таксама дасягнуў пэўных поспехаў. У 972 г. Ян Цымісхій пачаў барацьбу супраць Абасідаў у Месапатаміі, падчас другой арабскай кампаніі ў 974-975 гг. візантыйцамі была занята амаль уся Сірыя і Палесціна. Нечаканая смерць імператара ў 976 г. вярнула ўладу сыну Рамана II – Васілю II. Знешнепалітчныя поспехі Рамана I Лакапіна і асабліва Нікіфара II Фокі і Яна I Цімісхія падрыхтавалі глебу для сапраўднага росквіту Рамейскай імперыі ў час праўлення Васіля II Балгарабойцы (976-1025). Абвешчаны імператарам яшчэ ў 963 г. ён доўгі час знаходзіўся ў ценю імператараў-палкаводцаў, а затым пад апекай еўнуха Васіля Лакапіна. У 985 г. ён адхіліў ад улады свайго апекуна і пачаў самастойнае праўленне. Пачатак аказаўся не вельмі ўдалым. У 986 г. візантыйская армія, якая ўзяла ў аблогу балгарскую сталіцу Срэдзец, была блакіравана і ўшчэнт разгромлена каля Траянавых варот, што прывяло да чарговага мецяжу Варды Фокі Малодшага. Пасланае супраць мяцежнікаў візантыйскае войска на чале з Вардай Склірам перайшло на іх бок. Задушыць гэтае паўстанне ўдалося толькі ў 989 г. пры дапамозе рускага князя Уладзіміра, які накіраваў вайсковую дапамогу, а таксама дзякуючы разладу паміж лідэрамі паўстання. У адносінах з Руссю візантыйцы выбралі праверany шлях хрысціянізацыі, у жонкі Ўладзіміру была ададдзена прынцэса Ганна, а сам князь прыняў хрысціянства.

Адчуваючы вострую неабходнасць у караблях для пераброскі войск Васіль II у 992 г. уступіў у саюз з венецыянцамі, якія дамагліся зніжэння мытных пошлін у сем разоў. З гэтага часу венецыянцы атрымалі эксклюзіўны статус у Канстанцінопалі, што ў далейшым негатыўным чынам адбілася на развіцці візантыйскай эканомікі. Тым не менш, у 1002 г. пры дапамозе венецыянцаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

візантыйцы выратавалі ад арабаў-фацімідаў сваю крэпасць Бары і захавалі свой стратэгічны плацдарм у Італіі.
У 1014 г. Васіль II дамогся значнага поспеху ў вайне з Балгарыяй. У бітвы каля Беласіцы (Стрымоне) балгары былі разбіты і больш чым 10 тыс. балгарскіх палонных былі асеплены, а затым адпушчаны дадому, пры гэтым кожнаму сотаму пакінулі адно вока. Да 1018 г. уся Балгарыя была заваявана Візантыяй. У васальную залежнасць ад Візантыі трапілі Сербія, Харватыя і горад Дзірахій на Адрыятычным узбярэжжы.
У 1021-1022 гг. у выніку вайны іверыйскім царом Георгіем I заходняя частка Грузіі ўвайшла ў склад імперыі. Была таксама захоплена частка Арменіі, а астатняя частка паводле Трапезундскага пагаднення мусіла ўвайсці ў імперыю пасля смерці цара Аванэса Смбата.
Маштабныя планы Васіль II меў у адносінах да лацінскага свету. У гэтыя планы ўваходзіла адваяванне Сіцыліі ў Фацімідаў, выдаць сваю пляменніцу Зою за германскага імператара Атона III і замацаваць на папскім прастоле падкантрольнага папу. Але смерць імператара ў 1025 г. падчас падрыхтоўкі да сіцылійскага паходу перашкодзіла рэалізацыі задумаў. Праз тры гады памёр яго брат суправіцель Канстанцін VIII ў Візантыі пачаўся працяглы палітычны крызіс.
Дзяцей у Васілія II не было, таму пасля смерці Канстапціна VIII у 1028 г. дынастычная лінія была працягнута яго дзвюма дачкамі - Зояй і Феадорай. Першы муж Зоі канстанцінопальскі эпарх Раман III Аргір (1028-1034) аказаўся нядрэнным адміністратарам, апекуном навукі і мастацтва, але няўдалым палкаводцам. Ён дазволіў вярнуцца ў сталіцу апальным прадстаўнікам правінцыяльнай знаці, адмяніў уведзены Васілём II алілегій для буйных земляўладальнікаў і ўступіў у канфлікт з Феадорай, прымусіўшы яе зысці ў манастыр. У 1034 г. ён быў звергнуты маладым фаварытам Зоі Міхаілам, які праз шлюб з састарэлай Зояй стаў імператарам Міхаілам IV Пафлагонам (1034-1041). Нягледзячы на перамогі візантыйскай арміі ў Сіцыліі, Міхаіл не здолеў замацаваць поспех. Яго канфлікт з палкаводцам Георгіем Маніакам, будучым патрыярхам Міхаілам Керуларыем і іншымі прадстаўнікамі знаці ў сукупнасці з паўстаннямі ў Балгарыі і іншых рэгіёнах імперыі значна аслабіла дзяржаву. Пасля смерці Міхаіла IV Пафлагона, імператарм стаў усанаўлённы Зояй Міхаіл V Калафрат. Ён адразу ж уступіў у канфлікт з прыдворнай арыстакратыяй і выслаў Зою з Канстанцінопаля. Праз чатыры месяцы пасля вацарэння Міхаіл V быў звергнуты ў выніку паўстання. Паўстанцы вызвалілі Зою і Феадору, паміж якімі разгарэлася канкурэнцыя. Пасля чарговага шлюбу Зоі імператарам стаў Канстанцін IX Манамах (1042-1055). Менавіта ў перыяд праўлення Канстанціна ў 1054 г. адбыўся канчатковы раскол хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную. У 1055 г. памёр Канстанцін IX і на працягу года улада належала Феадоры, якая ў якасці свайго пераемніка выбрала лагафета Міхаіла VI Страціёціка (1056-1057). Аднак зямельная арыстакратыя абвясціла імператарам Ісаака I Камніна (1057-1059), які ў бітве каля Нікеі ў 1057 г. разграміў верныя Міхаілу VI войскі і захапіў уладу у краіне. Праз два гады Ісаак памёр,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

перадаўшы ўладу свайму паплечніку Канстанціну Х Дуку (1059-1067), які не здолеў справіцца з выклікамі свайго часу, у прыватнасці з ўзмацненнем туркаў-сельджукаў на ўсходзе імперыі. У 1061 г. патрыятычна настроеныя ваенныя паспрабавалі звергнуць Канстанціна Х, але змова была раскрыта. Пасля яго смерці пры дапамозе арміі імператарам стаў Раман IV Дыяген (1068-1071), які адразу прыняўся вырашаць "сельджуцкае" пытанне. Нягледзячы на слабасць візантыйскай арміі ў канцы XI ст., вынікі паходаў 1068-1069 гг. аказаліся даволі ўдалымі. Але захоп нарманамі Бары ў Італіі вымусіў Рамана IV перанесці цяжар барацьбы на захад. У гэты час сельджукі разграмілі візантыйскую армію на ўсходзе імперыі і авалодалі стратэгічнай крэпасцю Манцыкерт. Гэта прымусіла перанесці вайсковую актыўнасць Візантыі зноў на ўсход. У 1071 г. адбылася генеральная бітва каля Манцыкерта, у якой візантыйская армія была ўшчэнт разгромлена, а імператар трапіў у палон.
Праціўнікі Рамана IV абвясцілі імператарам Міхаіла VIII Дуку (1071-1078), што прывяло да пачатку вайны паміж прыхільнікамі новага імператра і прыхільнікамі адпушчанага сельджукамі Рамана IV. Перамога Міхаіла VIII у гэтым змаганні не спыніла міжусобную барацьбу. У 1077-1078 г. мецяжы паднялі адразу два палкаводцы – Нікіфар Урыеній Старэйшы і Нікіфар Ватаніят. У сакавіку 1078 г. канстанцінопальская знаць прымусіла Міхаіла VIII да пострыгу ў манахі і абвясціла імператрам Нікіфара III Ватаніята (1078-1081), які праз шлюб з жонкай папярэдняга васілеўса Марыяй паспрабаваў легітэмізаваць сваю ўладу. Але ўладу Нікіфара III не прызнаў Нікіфар Урэній Старэйшы, які таксама абвясціў сябе імператарм. У Малой Азіі падняў мяцеж Нікіфар Мелісін. Сасатарэлы імператар не ўдзельнічаў у паходах супраць сваіх праціўнікаў, даручыўшы гэтую справу маладому палкаводцу Аляксею Камніну, які удала справіўся з пастаўленай задачай. Але ў 1081 г. Аляксей сам арганізаваў мяцеж і звергнуў састарэлага імператара.

**2. Эпоха Камнінаў (1081-1180).**

Нягледзячы на пэўныя знешнепалітычныя поспехі Аляксея I Камніна (1081-1118), тым не менш Візантыя знаходзілася ў вельмі няпростым становішчы. З захаду імперыі пагражалі сіцылійскія нарманы, якія пачалі вайну за кантроль над Дырахіем, што доўжылася з 1081 па 1085 гг. У гэтай барацьбе Аляксей Камнін вымушаны быў забраць нават частку царкоўнага рыштунку на ўтрыманне арміі, а таксама пачаць пошук саюзнікаў, што ў наступным дало плённы вынік. Удала для імперыі скончыліся і войны супраць печанегаў 1086-1091 гг., якіх рамеі разграмілі ў саюзе з полаўцамі. Але ў Малой Азіі склалася зусім іншая сітуацыя.
Разгром рамейскай арміі каля Манцыкерта ў 1071 г. і наступная міжусобная барацьба прывяла да значнага скарачэння візантыйскай тэрыторыі. Да канца XI ст сельджукі захапілі практычна ўсе азіяцкія ўладанні Візантыі. Страта рэсурснай базы Візантыі паставіла краіну на мяжу знішчэння, таму новаму імператару давялося пераступіць праз шматвекавыя забабоны ў адносінах з заходнім светам і пачаць перамовы з лідарамі лацінян. Пры гэтым Аляксей I выказаў гатоўнасць абмеркаваць і пытанні веравызнання, сварка двух лідараў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хрысціянскага света адбылася толькі за 40 гадоў да апісваемых падзей. Саюзнікамі візантыйцаў сталі венецыянцы, якія ўжо мелі ўдалы вопыт супрацоўніцтва з рамеямі з часоў Васіля II Балгарабойцы, а таксама атрымалі сур'ёзныя гандлёвыя прывілеі і заснавалі сваю калонію ў сталіцы імперыі.

У лістападзе 1095 г. на Клермонскім саборы зарадзіўся крыжацкі рух, які Аляксей I выкарыстаў у сваіх інтарэсах. Прыбыўшыя ў 1096 г. у Канстанцінопаль еўрапейскія рыцары прынеслі васальную прысягу візантыйскаму імператару і ў выніку сумеснае рамейска-крыжацкае войска рушыла ў Малую Азію. У чэрвені 1097 г. крыжакі ўзялі ў аблогу Нікею, якая здалася візантыйцам пад гарантыі бяспекі гараджан, што абурыла еўрапейскіх рыцараў. Пасля разгрому сельджукаў у бітве каля Дарылеі 1 ліпеня 1097 г. рамеі вярнулі сабе частку малаазіяцкага ўзбярэжжа, а таксама астравы Родас і Хіяс. Аднак крыжакі сталі паступова выходзіць з-пад апекі рамеяў. У 1098 г. узнікла Эдэскае графства, якое не было перададзена Візантыі. Пасля захопу Антыёхіі крыжакі ўтварылі тут сваю дзяржаву, адмовіўшыся ад васальнай прысягі. Хутка ўзнікла яшчэ адна дзяржава – Іерусалімскае каралеўства, на тэрыторыю якога таксама прэтэндавала Візантыя. Аднак разгром крыжакоў каля Харана ў 1104 г. аказалася на карысць рамеям. Антыяхійскі князь прызнаў свой васалітэт ад Візантыі, яе верным саюзнікам стаў таксама трыпальскі князь.

Палітыка Аляксея I была працягнута яго спадкаемцамі: сынам Янам II (1118-1143) і ўнукам Мапуілам I (1143-1180) Камнінамі. Ян II па мянушкам Маўр або Калаян (Прыгожы Ян), прытрымліваўся стратэгіі свайго бацькі і актыўна ваяваў на ўсходзе з сельджукамі, а на захадзе імкнуўся наладзіць цесныя кантакты з еўрапейскімі манархамі.

У 1118-1121 г. ён правёў паспяховае наступленне на сельджукаў у Малой Азіі, у 1122 г. былі разгромлены печанегі. Але ў вайне з Венецыяй 1122-1126 гг. Візантыя прайграла і вымушана была пацвердзіць усе ранейшыя гандлёвыя правы венецыянцаў. Традыцыйна напруджанамі былі ўзаемаадносіны з сіцылійскмі нарманамі, але гэта не перашкодзіла Яну II праводзіць актыўную наступальную палітыку ў азіяцкім накірунку.

У 1130-1135 гг. у барацьбе з сельджукамі рамеі адваявалі цэнтральную частку Малой Азіі, у 1137 г. рамеі захапілі Кілікійскую Арменію, прымусілі крыжацкіх правіцелей Антыёхіі і Эдэсы да васальнай прысягі, пасля чаго ў Антыёхію вярнуўся праваслаўны патрыярх, а ў 1138 г. правялі паспяховы паход супраць Масульскага эміратa. Як нашчадак вайсковай арыстакратыі Ян II ўсё жыццё правёў у паходах і памёр у 1143 г. падчас чарговага паходу супраць сельджукаў. Вынікі праўлення Яна II аказаліся супярэчлівымі, з аднаго боку Візантыя сур'ёзна ўмацавалася ў Малой Азіі, але з іншага боку яе гаспадарка апынулася ў яшчэ большай залежнасці ад венецыянцаў. Варожымі заставаліся ўзаемаадносіны з сіцылійскімі нарманамі.

Стаўшы імператарам, Мануіл I Камнін (1143-1180) працягнуў палітыку сваіх папярэднікаў. Другі крыжовы паход новы імператар сустрэў з насцярожанасцю, таму што ўмацаванне крыжацкіх дзяржаў, асабліва Антыёхіі не адпавядала інтарэсам Візантыі. Нягледзячы на тое, што рамеі прадставілі праход

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

германскаму і французскаму войскам праз сваю тэрыторыю, там не менш, яны заключылі тайны абарончы саюз з сельджукамі.

Сур'ёзныя намеры Мануіл I меў у дачыненні да Італіі. Пасля заканчэння другога крыжовага пахода паміж Мануілам і германскім імператарам Конрадам III адносіны палепшыліся, што дазволіла заключыць альянс, куды ўвайшла яшчэ і Венецыя, супраць агульнага праціўніка – сіцылійскага караля Ражэра II. Дарэчы, дзякуючы добрым узаемаадносінам Мануіла з Конрадам III удалося адвесці пагрозу захопа Канстанцінопаля альянсам сіцылійскага караля Ражэра II і французскага караля Людовіка VII. У выніку баявых дзеянняў у 1147-1155 гг. візантыйцы здолелі адваяваць Апулію ў Італіі. Поспехі ў барацьбе з нарманамі прывялі да зблíжэння імператара з папам Адрыянам IV і выпрацоўкі ў 1155 г. ідэі адраджэння адзінства хрысціянства праз заключэнне царкоўнай уніі. Аднак разгром візантыйцаў у Італіі ў 1158 г. пакінуў гэтую ідэю на ўзроўне праекта. Пасля паражэння ў Паўднёвай Італіі мэтай Мануіла стала барацьба за аслабленне пазіцый Свяшчэннай Рымскай імперыі ў гэтым рэгіёне. Гэта тлумачылася пагаршэннем адносін з германскім імператарам Фрыдрыхам I Барбаросай, які называў Мануіла не імператарам Візантыі, а каралём грэкаў. Візантыя падрымала створаную ў 1167 г. антыгерманскую Ламбардскую лігу, якая здолела нанесці паражэнне германцам у бітве каля Леньяна ў траўні 1176 г. Нягледзячы на ўзрастанне аўтарытэта Візантыі ў Італіі рэзка пагоршыліся ўзаемаадносіны з Венецыяй. Для аслаблення пазіцый венецыянцаў у 1169 быў падпісаны гандлёвы дагавор з Генуяй, а ў наступным годзе аналагічны дагавор з Пізай. У 1171 г. у Канстантынопалі пачалося антылацінскае паўстанне, адбылася канфіскацыя маёмасці замежнікаў, што ў першую чаргу было скіравана супраць венецыянцаў. Але небяспека зблíжэння венецыянцаў з сіцылійцамі вымусіла Мануіла I адступіцца. Пасля заключэння ламбардцамі міра з Фрыдрыхаі I Барбаросай ў 1177 г. італьянская палітыка ў Італіі зайшла ў тупік.

Больш паспяховай быў балканскі вектар знешняй палітыкі Візантыі. У серыі войн з сербамі (1150-1152) і венграмі (1151-1153, 1163-1168) рамеі захапілі Адрыятычнае ўзбярэжжа і паставілі ў залежнасць Венгерскае каралеўства. Быў распрацаваны нават план інкарпарацыі Венгрыі праз каранацыю венгерскага каралевіча ў Візантыі пасля смерці Мануіла I, але гэты праект не быў рэалізаваны. У барацьбе з венграмі рамеі апіраліся на падтрымку князёў ужо раздробленай Русі.

Адносіны з блізкаўсходнімі дзяржавамі таксама былі няпростымі. У 1150-х гг. Мануілу I давялося сутыкнуцца з сепаратызмам армянскіх і лацінскіх васалаў. У 1156 г. кіраўнік Антыёхіі Рэно дэ Шацільён напаў на в. Кіпр, што вымусміла Мануіла дзейнічаць неадкладна. У 1158-1159 гг. рамейскае войска зноў падпарадкавала Кілікійскую Арменію, а затым і Антыёхію. Шляхам шлюбнай дыпламатыі Мануіл I усталяваў саюзніцкія адносіны з іерусалімскім каралём Амары I, вынікам чаго стала сумесная спроба заваявання ў 1169-1171 гг. Каірскага халіфата, якая, аднак, скончылася няўдала.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Найбольш складаная сітуацыя склалася ў барацьбе з сельджукамі. Нягледзячы на пэўныя поспехі ў гэтым накірунку ў 1158-1161 гг, у 1176 г. армія рамеяў была ўшчэнт разбіта ў бітве каля Мірыякефала. Нягледзячы на тое, што маштабы паражэння былі значна меншымі, чым у бітве каля Манцыкерта, удар па прэстыжу Візантыі быў нанесены вялізарны.

Мануіл І стаў апошнім рэальна дзеючым прадстаўніком Камнінаўскага адраджэння – перыяду пад'ёму Візантыі ў палітычным, ваенным, фінансавым і культурным жыцці. Камніны, асабліва Мануіл І, "прыадчынілі" Візантыю для лацінян. Пачалося актыўнае супрацоўніцтва імперыі з вядучымі краінамі лацінскага свету. Ян ІІ і асабліва Мануіл І сталі прадстаўнікамі новай генерацыі імператараў, якія прадстаўлялі сваеасаблівы сімбіёз дзвюх рознаскіраваных культур – лацінскай і рамейскай. У самой імперыі з'явілася вялікая кольскасць прадстаўнікоў лацінскага свету, а сярод рамеяў сварміравалася значная "празаходняя партыя".

Але ўсе дасягненні Візантыі эпохі Камнінаў былі знішчаны пасля смерці Мануіла І. Падчас праўлення малагадовага імператара Аляксея ІІ Камніна ў краіне разгарнулася жорсткая барацьба паміж прыхільнікамі "лацінскай" і "патрыятычнай" партый. У выніку другога антылацінскага паўстання ў 1181 г.да ўлады прыйшоў стрыечны брат Мануіла - Андранік І Камнін (1183-1185). На хвалі патрыятычнага ўздыму былі забіты ўдава Мануіла І і яго сын Аляксей ІІ. Праведзеныя ж новым васілеўсам рэформы, фактычная капітуляцыя перад Венецыяй і пераслед арыстакратыі актывізавалі цэнтрабежныя тэндэнцыі ў імперыі. З-пад кантроля Візантыі адышлі Сербія і Венгрыя, прычым апошняя захапіла ў Візантыі Далмацыю і значную частку Харватыі, сіцылійскія нарманы захапілі Фесалонікі, а правіцель Кіпра Ісаак Камнін, абвясціў незалежнасць вострава.

**3. Чацвёрты крыжовы паход і стварэнне Лацінскай імперыі.**

Чацвёрты крыжовы паход і стварэнне Лацінскай імперыі. У 1285 г. супраць Андраніка і пачалося паўстанее, якое ўзначаліў яго сваяк Ісаак ІІ Анёл (1185-1195, 1203-1204). Новы імператар заключыў з Венецыяй у 1187 г. вельмі выгадны абаронча-наступальны саюз. Паводле ўмоў гэтага саюзу імперыя вяртала Венецыі ўсе яе былыя прывілеі і прадастаўляла поўны падатковы імунітэт на ўсёй тэрыторыі Візантыі. Праўда для стварэння канкурэнцыі венецыянцам ён у 1192 г. падцвердзіў прывілеі генуэзцам і пізанцам, але ў любым выпадку гэта негатыўна адбівалася на ўласнай гандлёвай сістэме.

У 1185 г. з-пад улады Візантыі выйшла Балгарыя. Спробы рамеяў у 1185-1195 гг. зноў іх падпарадкаваць аказаліся беспаспяховымі. Падчас трэцяга крыжовага пахода 1189-1192 гг. Ісааку давялося лавіраваць паміж еўрапейскімі рыцарамі і арабамі. Нягледзячы на разгром Ісаакам ІІ сіцылійскіх нарманаў каля Дзімітрыцы ля Фесалонік у 1185 г., пасля каранацыі германскага караля Генрыха VI сіцылійскай каронай небяспека з боку Сіцыліі яшчэ больш узмацнілася.

Пасля дзесяці гадоў праўлення Ісаак ІІ был дэтранізаваны і асleплены сваім братам Аляксcем ІІІ Анёлам (1195 1203). Знешнепалітычнае стаповішча

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Візантыі ўскладнілася як ніколі. На працягу ўсяго праўлення Аляксею III давялося пастаянна падаўляць мецяжы, а актыўная балканская палітыка вымусіла правіцеляў Венгрыі, Сербіі і Балгарыі звярнуцца да папы Інакенція III з просьбай забяспечыць ім незалежнасць ад Візантыі. Венецыя таксама была незадаволена існаваннем у Візантыі канкурэнцыі з боку генуэзцаў і пізанцаў, якім спрыялі рамеі. У турнэ па еўрапейскім сталіцам знаходзіўся сын асляплённага Ісаака II Аляксей Анёл, які шукаў дапамогі ў звяржэнні Аляксея III. Змена характара IV крыжовага пахода ў 1203 г. стварыла спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення гэтага плана. У канцы чэрвеня 1203 г. крыжакі высадзіліся каля Канстанцінопаля і разграмілі армію візантыйцаў. З узятай у аблогу сталіцы Аляксей III уцёк, пасля чаго жыхары горада вызвалілі Ісаака II Анёла і абвясцілі імператарам яго і яго сына Аляксея IV Анёла. Аднак немагчымасць новым і старым імператарамі выплаціць грашовы доўг крыжакам абвастрылі ўзаемаадносіны паміж былымі саюзнікамі. Рабаванне крыжакамі мусульманскага квартала сталіцы, што прывяло да вялікага пажару ў горадзе, павышэнне падаткаў у скупнасці з дыскрэдытацыяй Аляксея IV бацькам Ісаакам II прывяло да дэтранізацыі абодвух і абвяшчэння імператарам Аляксея V Дукі Мурзуфула (1204). Ён паспрабаваў вырашыць пытанне з крыжакамі сілавым чынам, дзеля чаго абклаў жыхароў Канстанцінопаля новымі падаткамі. Але сілавы варыянт аказаўся не на карысць візантыйцаў. У ходзе штурмаі крыжакамі Канстанцінопаля 9-12 кастрычніка 1204 г. горад быў узяты і жорстка разрабаваны, а сама Візантыйская імперыя з каранацыяй Балдуіна I Фландрскага знікла, саступіўшы месца новаўтворанай Лацінскай імперыі.

Яшчэ ў сакавіку 1204 г. паміж лідарамі крыжакоў быў заключаны дагавор, паводле якога Візантыя мусіла быць падзелена на чатыры часткі: адна пераходзіла да імператара, другая - пад кантроль Венецыі, а две астатніх дзяліліся паміж іншымі крыжацкімі правадырамі. Пасля каранацыі імператар атрымаў частку Фракіі і некаторыя астравы Эгейскага мора. На Балканах былі створаны васальныя Фесаланікійскае каралеўства (1204-1224), Афінская сеньёрыя, а затым герцагства (1205-1456), Марэйскае або Ахейскае княства (1205-1432). Узнікла таксама і Венецыянская Раманія, у склад якой увайшла частка Канстанцінопаля і значная частка астравоў Эгейскага мора. Крыжакі прынеслі ў Візантыю феадальныя адносіны, заснаваныя на шырокім распаўсюджанні даменіяльнай гаспадаркі. Узмацнілася залежнасць сялян ад сеньёра, асноўнай катэгорыяй залежнага селяніна сталі парыкі або віланы. Аднак на перэферыі мясцовыя правіцелі не прызналі новага імператара і, такім чынам, сталі ўтварацца поствізантыйскія дзяржавы. На Балканах такой дзяржавай стала Эпірскае царства, а ў Малой Азіі Нікейская і Трапезундская імперыі. Сур'ёзным праціўнікам лацінян з'яўляліся таксама балгары.

У 1205 г. крыжацкае войска пацярпела цяжкае паражэнне ад балгарскага цара Калаяна каля Адрыянапаля. Нягледзячы на часовую стабілізацыю ў імперыі падчас праўлення Генрыха I (1205-1216) становішча лацінскіх правіцеляў працягвала быць нетрывалым. У 1213 г. імператар выступіў супраць гвалтоўнага навязвання царкоўнай уніі, што павысіла яго папулярнасць сярод

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рамееў. Асцярожная ўнутраная і знешняя палітыка Генрыха І дазволіла яму заключыць мір з балгарамі і нікейцамі. Аднак усе дасягненні Генрыха І былі перакрэслены яго пераемнікамі. Імператар Пётр І дэ Куртэнэ (1216-1217) трапіў у палон да эпірцаў, а наступны манарх Роберт дэ Куртэнэ аказаўся не вельмі ўдалым дыпламатам. У барацьбе з нікейскім імператарам Янам ІІІ Дукам Ватацам ён страціў практычна ўсю Малую Азію і дазволіў нікейцам авалодаць Адрыянапалем. Апошні лацінскі імператар Балдуін ІІ дэ Куртэнэ (1228-1261) аказаўся не ўстане супрацьстаяць набіраючай сілу Нікейскай імперыі. У 1240 г. нікейцы яшчэ больш звузілі тэрыторыю лацінян. У 1246 г. нікейская армія авалодала Фесалонікамі, у 1259 г. у бітве каля Пелагона рамеі атрымалі рашучую перамогу, а ў 1261 г. у саюзе з генуэзцамі авалодалі Канстанцінопалем, у выніку чаго Лацінская імперыя пала. На Балканах засталіся асклепкі крыжацкіх дзяржаў, большая ўстойлівасць якіх была абумоўлена ўцягваннем мясцовых арыстакратаў – архонтаў у палітычнае жыццё разам з лацінскімі рыцарамі. Змешаныя шлюбы садзейнічалі збліжэнню двух этнічных груп пануючага стану, праходзіў працэс элінізацыі заходнееўрапейскіх рыцараў. Гэта садзейнічала таму, што візантыйцы здолелі авалодаць Марэйскім княствам толькі ў 1428-1432 гг., а Афінскае герцагства ўвогуле было захоплена Асманскай імперыяй ужо пасля падзення Візантыі ў 1456 г.

**ТЭМА 5 Візантыя ў познім сярэднявеччы.**

*1. Адраджэнне Візантыйскай імперыі ў XIII ст.*
*2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Візантыі ў XIII-XV ст.*
*3. Унутрыпалітычная сітуацыя ў Візантыі XIV-XV ст.*
*4. Падзенне Візантыі.*

1. Адраджэнне Візантыйскай імперыі ў XIII ст.

Падзенне Канстанцінопаля ў 1204 г. і стварэнне Лацінскай імперыі не здолела цалкам знішчыць рамейскую дзяржаўнасць. На непадкантрольным крыжакам тэрыторыях былой Візантыі ўтварыўся шэраг поствізантыйскіх дзяржаў. На Балканскім паўвостраве такім гаспадарствам стала Эпірскае царства, у Малой Азіі – Нікейская імперыя, а на паўднёвым узбярэжжы Чорнага мора – Трапезундская імперыя. Гэтыя дзяржавы ўступілі ў барацьбу з крыжакамі, а таксама знешнімі сіламі (балгарамі, сельджукамі), што не перашкаджала ім канкурыравіць паміж сабой за права авалодаць былой сталіцай Візантыі.

Адразу пасля разгрому Рамейскай імперыі з-пад улады новых лацінскіх гаспадароў выйшлі балгары, што прывяло да ўзнікнення другога Балгарскага царства. Зацягуты барацьбой з балгарамі лацінскі імператар Балдуін І Фландрскі аказаўся не ў стане ўтрымаць пад кантролем Нікею, дзе замацаваўся зяць былога васілеўся Аляксея ІІІ Анёла Фёдар Ласкарыс, які ў 1206 г. быў абвешчаны імператарам. У 1210 г. новы імператар разгаміў сельджукаў пад Антыёхіяй, паланіўшы пры гэтым свайго цесця імператара Аляксея ІІІ, а затым у 1212 г. нанёс паражэнне свайму трапезундскаму канкурэнту. У 1214 г. паміж лацінскім імператарам Генрыхам І Фландрскім і нікейскім імператарам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Фёдарам I Ласакрысам быў заключаны мір, замацавыяны пазней шлюбам, які фактычна азначаў адмову лацінян ад прэтэнзій на землі Нікейскай імперыі.
Ян III Дука ВатацУ 1224 (1225) г. новы нікейскі імператар Ян III Дука Ватац у бітве каля Лампсакі разграміў войска лацінскага імператара Роберта дэ Куртэнэ, пасля чаго рамеі занялі практычна ўсё малаазіяцкае ўзбярэжжа, высадзіліся ў Фракіі і авалодалі Адрыянапалем.
У той жа час, на Балканах эпірскі дэспат Фёдар Камнін Дука ў змаганні з лацінянамі і балгарамі значна пашырыў межы сваёй дзяржавы, у 1224 г. ён захапіў Фесалонікі і абвясціў сябе імператарам. Такім чынам, на адно імператарскае месца з’явілася два прэтэндэнты, што прывяло да пачатку барацьбы паміж двумя поствізантыйскімі дзяржавамі. Падыход эпірскага войска да Адрыянапаля вымусіў нікейскага імператара адступіць, але ўжо ў 1230 г. сітуацыя змянілася. У бітве каляЭпір Клакатніцы балгарскі цар Іван Асень разграміў эпірцаў, а сам імператар Фёдар Камнін Дука трапіў у палон і быў аслеплены. У 1235 г. быў заключаны шлюбны саюз паміж балгарамі і нікейцамі, што дала магчымасць Яну III Дуку Ватацу зноў авалодаць еўрапейскім узбярэжжам праліваў. У 1240 г. нікейцы яшчэ болш звузілі тэрыторыю лацінян. У 1246 г. нікейская армія авалодала Фесалонікам, у 1248 г. эпірскі імператар Міхаіл II адмовіўся ад імпераітарскага тытула, а ў 1254 г. Міхаіл II ужо як эпірскі дэспат прызнаў над сабой уладу нікейскага васілеўса. Такім чынам, Ян III Дука Ватац стаў адзіным імператарам рамейскім імператарм.
З узвышэннем Нікейскай імперыі праходзіла ўзвышэнне і аднаго з нікейскіх палкаводцаў Міхаіла Палеолага. Падчас кароткачасовага праўлення Фёдара II Ласкарыса Міхаіл апынуўся ў апале, аднак пасля яго смерці ў 1259 г. ён сілай захапіў апеку над 9-гадовым сынам папярэдняга імператара Янам IV Ласакрысам, а праз год абвясціў сябе яго суправіцелем. У 1261 г. нікейская армія ў саюзе з генуэзцамі авалодала Канстанцінопалем, у выніку чаго Лацінская імперовыя пала. Міхаіл VIII Палеалог абвясціў сябе візантыйскім імператарм, рэаніміраваўшы гэтую дзяржаву.
Міхаіл VIII ПалеалогМіхаіл VIII Палеолаг (1261-1282) адразу здзейсніў першасныя неабходныя захады на аднаўленні сталіцы, павелічэнню яе насельніцтва, забеспячэнню абараназдольнасці. Для ажыўлення эканамічнай дзейнасці і прыцягнення грошай былі прадастаўлены прывілеі генуэзскім купцам, была заснавана генуэзская гандлевая калонія ў Галаце. Крыху пазней удалося вярнуць некаторыя тэрыторыі з ліку захопленых крыжакамі, у Марэі і на астравах. Аднак рэсурсная база краіны павялічылася нязначна ў параўнанні з Нікейскай імперыяй. Праводзіць актыўную знешнюю палітыку ваеннымі сродкамі Візантыя была няздольная. Новую актуальнасць набыло пытанне пра выжыванне, прычым цяпер галоўная роля належала візантыйскай дыпламатыі
Больш таго, асляпленне малагадовага Яна IV Ласкарыса выклікала незадавальненне ў грамадстве, канфлікт з патрыярхам, які ў 1262 г. нават адлучыў імператара ад царквы. Гэты канфлікт удалося вырашыць толькі ў 1266 г. праз прызначэнне новага патрыярха..

Небяспечным аказалася і міжнароднае становішча Візантыі. Галоўная небяспека для імперыіКарл Анжуйскі зыходзіла ад брата французскага караля Людовіка IX Карла Анжуйскага. У 1266 г. ён атрымаў карону Сіцылійскага каралеўства і пачаў бурную дзейнасць на фарміраванні антывізантыйскай кааліцыі, арганізацыі крыжовага паходу з удзелам венгерскага караля Белы IV з мэтай аднаўлення Лацінскай імперыі.
У гэтых складаных гістарычных умовах Міхаіл VIII зрабіў, як можна меркаваць, адзіна магчымы крок, які даў пэўную адтэрміноўку палітычнаму краху імперыі. Ён прананаваў падпарадкаваць канстанціпопальскую царкву Рыму. Пры гэтым Міхаіл VIII спадзяваўся, што папа рымскі будзе пазбаўлены зачэпкі для паўтарэння сцэнара чацвёртага крыжовага паходу. Відавочна, што з боку Візантыі гэтая прапанова ўяўляла толькі дыпламатычны ход, але стаўленне да яе Грыгорыя X было дастаткова сур'ёзным і на II Ліёнскім саборы (1274) візантыйская дэлегацыя ад імя імператара была вымушапа выказаць сваё падпарадкаванне папству. Прынятая ўнія прадугледжвала вяршынства рымскага папы пад усёй хрысціянскай царквою, яго кананічную юрысдыкцыю, памінанне падчас набажэнстваў. Аднак дадзеная лінія Міхаіла VIII выклікала фарміраванне апазіцыі, скіраванай супраць лацінян, у самой Візантыі. Праўда, яна жорстка праследавалася імператарскай уладай. Зробленыя захады ў пэўнай ступені нейтралізавалі папу рымскага, але не Карла Анжуйскага, які ў 1281 г. арганізаваў уварванне ў Візантыю з сушы, а калі атака была адбіта - з мора. Прычым цяпер яго падтрымалі Венецыя, Сербія і Балгарыя. Планы Карла Анжуйскага, аднак, былі сарваны паўстаўстаннем на Сіцыліі ў 1282 г. і пераходам вострава пад кантроль Арагона. Магчыма, што нейкую ролю ў падрыхтоўцы выступлення сіцылійцаў адыгралі візантыйскія агенты. Як бы то ні было, але імперыя была выратавана. У хуткім часе Міхаіл VIII памёр, а наступны васілеўс Андронік II ў 1282 г. адмовіўся ад уніі.

**2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Візантыі ў XIII-XV ст.**

Адрозненні сацыяльна-эканамічных адносін у Візантыі ад большасці краін Заходняй Еўропы былі настолькі значнымі, што правамерна ўзнікае пытанне аб тым, ці можна наогул гаварыць аб феадальных адносінах у пераемніцы Рымскай імперыі, чыё існаванне ахоплівала амаль усю тысячагадовую гісторыю сярэднявечча. Вырашэнне праблемы ўскладняецца тым, што да нас дайшла невялікая колькасць патрэбных першакрыніц, а тыя, што захаваліся, нярэдка даюць няпоўную, а то і супярэчлівую інфармацыю.
Найбольш аптымальным шляхам даследавання праблемы феадалізму ўяўляецца параўнанне адносін асабістай залежнасці (сувязі панавання - падпарадкавання) у Візантыі і ў Заходняй Еўропе. Пры гэтым даволі цікава будзе параўнаць шэраг з'яў у сацыяльных адносінах Візантыі і цывілізацый Азіі, якія пры ўсіх нацяжках наўрад ці можна ахарактарызаваць як феадальныя.
У Візантыі не склаліся адносіны сюзерэнітэту - васалітэту, феадальнай іерархія. Гэта тлумачыцца, перш за ўсё, тым, што ў Візантыі (у адрозненне ад Захаду) не сфарміраваўся феод як спадчыннае зямельнае ўладанне, падараванае сеньёрам васалу за службу. Шэраг вучоных даказвае, што ў канцы існавання аналагам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

заходнееўрапейскаму феоду ў Візантыі з'яўлялася пронія (першакрыніцы фіксуюць яе з'яўленне ў XI ст.) - дзяржаўнае падараванне асобным людзям за службу ці манастырам права збору на сваю карысць падаткаў з сялян на пэўнай тэрыторыі. Гэта было пажыццёвае імператарскае падараванне, і толькі зрэдку ў позняй Візантыі пронія рабілася спадчыннай. Візантыйская пронія больш нагадвала не заходнееўрапейскі бенефіцый (а тым больш феод), а такія формы ўмоўных падараванняў, якія былі вядомы ў суседніх мусульманскіх краінах. Гэта ікта (у Арабскім халіфаце і дзяржавах, якія склаліся пасля яго распаду) і цімар у Асманскай дзяржаве. Мусульманскія правіцелі надзялялі асобных людзей (галоўным чынам, воінаў) правам збіраць падаткі з земляробоў на пэўных тэрыторыях, прычым памеры падаткаў строга фіксаваліся і кантраляваліся дзяржаўнай уладай. Ні іктадар, ні цімарыёт не мелі права павялічваць іх самавольна, уласнай гаспадаркі яны не вялі. І ікта, і цімар з цягам часу праявілі тэндэнцыю да ператварэння падаравання з умоўнага пажыццёвага ў спадчыннае. Да чаго б прывяло развіццё пронііі ў Візантыі, нам ніколі не даведацца - на яе тэрыторыі, захопленай туркамі, усталявалася цімарная сістэма.

І ў згаданых сярэдневяковых дзяржавах Азіі, і ў Візантыі вызна чальная роля ў пазямельных адносінах належала дзяржаўнай уладзе. У Візантыі яна (у адрозненне ад Заходняй Еўропы) сур'ёзна тармазіла развіццё прыватнафеадальнай уласнасці на зямлю, а таксама пазямельнай і асабістай залежнасці сялян ад феадалаў. У Візантыі існавалі буйныя вотчыны, але гэта былі не проніі, а, галоўным чынам, уладанні імператарскай сям'і, буйных чыноўнікаў, манастыроў, хаця статусу «трымання» візантыйскае права не ведала. Вотчыннікі мелі шырокія правы імунітэту, але і тут існавалі пэўныя абмежаванні. Дзяржава, напрыклад, магла ўказваць, якую максімальную колькасць залежных сялян павінен мець вотчыннік, а чыноўнікі мелі права ўступаць на тэрыторыю вотчын і вызначаць памеры падаткаў.

Намнога больш марудна, чым у Заходняй Еўропе, у Візантыі ішоў працэс фарміравання адзінага слоя залежнага сялянства. Да ўзяцця Канстанцінопаля туркамі першакрыніцы сведчаць аб наяўнасці мноства катэгорый сялян розных ступеняў і форм залежнасці. Галоўнай катэгорыяй залежных сялян былі парыкі - трымальнікі чужой (панскай ці дзяржаўнай) зямлі, якія выконвалі павіннасці на карысць дзяржавы і вотчынніка. Парыкі былі замацаваны за ўласнікамі, перш за ўсё, з-за фіскальных патрэб (парык мог мяняць месца жыхарства, але пры гэтым быў абавязаны выконваць павіннасці, няхай нават і не на зямлі). Наогул, у аснове рэнтных адносін у Візантыі (у адрозненне ад Заходняй Еўропы) ляжалі не столькі пазямельныя адносіны, колькі права атрымання падаткаў і павіннасцей. Парыкі былі прыватнаўласніцкімі і дзяржаўнымі, але ўсе яны плацілі дзяржаўныя падаткі. У Візантыі не назіралася такой дыферэнцыяцыі сялянства па маёмаснаму прынцыпу, як у Заходняй Еўропе. Буйныя зямельныя трыманні парыкаў былі адзінкавымі выключэннямі, тыповымі ж з'яўляліся карлікавыя трыманні і адсутнасць іх наогул. У апошнім выпадку падаткамі абкладаліся хатняя нерабочая жывёла, пладовыя дрэвы,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

апрача таго, дзейнічаў падушны падатак, што вяло да росту колькасці бедных і маламаёмасных сялян.

Увогуле можна зрабіць вывад, што феадальныя адносіны ў Візантыі не дасягнулі такой ступені дасканаласці, як у Заходняй Еўропе. У Візантыі адсутнічаў або атрымаў слабае развіццё шэраг істотных элементаў: адносіны сюзерэнітэту - васалітэту, прыватная феадальная ўласнасць на зямлю, зямельная рэнта. У адрозненне ад Заходняй Еўропы ў пазямельных, рэнтных адносінах значная роля належала дзяржаве, якая ў значнай ступені выступала іх рэгулятарам. Гэта збліжала сацыяльныя адносіны ў Візантыі з адносінамі ў шэрагу азіяцкіх цывілізацый сярэдневякоўя.

Дзяржаўная рэгламентацыя была сур'ёзным тормазам для эканамічнага і сацыяльнага жыцця і візантыйскіх гарадоў. У іх так і не склалася самакіраванне накшталт гарадскіх камун у Заходняй Еўропе. Галоўная роля ў гарадскім кіраванні ў Візантыі належала дзяржаўным чыноўнікам альбо буйным феадалам (асабліва ва ўмовах дэцэнтралізацыі і аслаблення імператарскай улады). У візантыйскіх гарадах не сфарміравалася асобае саслоўе гараджан, як гэта было ў Заходняй Еўропе. Візантыйскія карпарацыі рамеснікаў і гандляроў мала нагадвалі заходнееўрапейскія цэхі і гільдыі. У познім сярэдневякоўі колькасць такіх карпарацый значна скарачаецца - яны рэдка ўпамінаюцца ў першакрыніцах, саступаючы карпарацыям маракоў, рыбакоў і г. д.

У Візантыі не ўзніклі мануфактуры, для гэтага не склаліся адпаведныя ўмовы, апрача таго, згубна ўплывала канкурэнцыя з боку больш танных і якасных вырабаў італьянскіх мануфактур. Італьянская канкурэнцыя, палітычная нестабільнасць не спрыялі ўкладванню грашовых сродкаў у візантыйскае рамяство, гэтыя сродкі, у значнай меры, накіроўваліся ў ліхвярства і гандаль, дзе верхаводзілі венецыянскія і генуэзскія купцы. Збядненне візантыйскіх рамеснікаў, абеззямельванне сялянства стваралі вялікую колькасць патэнцыяльных наёмных работнікаў, але яны заставаліся незапатрабаванымі або часткова паглыналіся сельскім рамяством. Познавізантыйскі горад у адрозненне ад заходнееўрапейскага так і не зрабіўся манапалістам у сферы рамяства. Вотчыннае, манастырскае, вясковае рамяство выступала канкурэнтам гарадскога. Па некаторых падліках, у візантыйскай вёсцы XIV ст. існавала не менш 1/3 рамёстваў, вядомых у гарадах. У гэтай канкурэнцыі многія невялікія гарады прыходзілі ў заняпад. Аграрызацыя закранула нават буйныя гарады, рамеснікі і гандляры якіх, каб выжыць, вымушаны былі апрацоўваць свае прысядзібныя прыгарадныя ўчасткі. Візантыйскі горад позняга сярэдневякоўя не меў такога сацыяльна-эканамічнага ўздзеяння на вёску, як заходне-еўрапейскія гарады.

У жыцці візантыйскага горада ўсё большую ролю адыгрывалі буйныя феадалы. Яны перасялялі ў гарады сялян-рамеснікаў (якія па-ранейшаму называліся парыкамі). У гарадах прадавалі сваю гаспадарчую прадукцыю не сяляне (для іх звычайна ладзіліся кірмашы ва ўладаннях буйных уласнікаў), а вотчыннікі, манастыры. Многія з іх мелі ўласныя гандлёвыя караблі і былі вызвалены ад гандлёвых пошлін.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Да сярэдзіны XIV ст. некаторыя візантыйскія гарады - Канстанцінопаль, Фесалонікі, якія знаходзіліся на важных шляхах міжнароднага гандлю, былі буйнейшымі экспарцёрамі збожжа на захад. Але асманскія заваяванні неўзабавеператварылі Канстанцінопаль з экспарцёра ў імпарцёра збожжа. Галоўную ролю ў забеспячэнні харчаваннем сталіцы Візантыі пачалі адыгрываць генуэзскія купцы. Генуя пасля 1261 г. актыўна ўмешвалася ў візантыйскую эканоміку, канкурыруючы з Венецыяй. Генуэзскія купцы дабіліся права на бяспошлінны гандаль на візантыйскай тэрыторыі, стварылі свае гандлёвыя калоніі ў буйных гарадах і на астравах. У канцы XIII ст. узнікла генуэзская калонія побач з Канстанцінопалем (на другім беразе бухты Залаты Рог) - Галата. Неўзабаве менавіта Галата кантралявала канстанцінопальскі гандаль і фактычна яна, а не сталіца, зрабілася эканамічным цэнтрам Візантыі. Даходы толькі ад мытных збораў генуэзскай Галаты перавышалі даходы імператарскай казны ў сярэдзіне XIV ст. амаль у сем разоў. Візантыйскія купцы, занятыя ў гандлі феадалы ператварыліся ў малодшых партнёраў генуэзскіх і візантыйскіх купцоў. Візантыя была напоўнена прадукцыяй італьянскіх мануфактур: тканінамі, зброяй, вырабамі з металу, шкла і г. д. Візантыйскае рамяство не магло канкурыраваць з імі. Праўда, панаванне італьянцаў у візантыйскім гандлі на некаторы час стымулявала вытворчасць прадметаў раскошы, але гэта не магло прывесці да ўздыму эканомікі Візантыі. Італьянскія прадпрымальнікі былі зацікаўлены і ў пастаўках сыравіны для мануфактур, але яны самі пранікалі ў адпаведныя сферы эканомікі Візантыі і ставілі іх пад свой кантроль. Мясцовае ж купецт ва ўсё больш адсоўвалася ад пасрэдніцкай ролі не толькі ў знешнім, але і ва ўнутраным гандлі. Візантыя, якую некалі называлі «краінай гарадоў», перажывала ў канцы свайго існавання глыбокі заняпад гарадскога жыцця.

### 3. Унутрыпалітычная сітуацыя ў Візантыі XIV-XV ст.

Візантыя 1265У позняй Візантыі правіла імператарская дынастыя Палеалогаў (1261-1453, з перапынкам на узурпацыю Яна VI Кантакузіна ў 1347-1354). Калі пры заснавальніку дынастыі Міхаілу VIII Палеалогу імперыі яшчэ ўдавалася пашыраць рубяжы, то пачынаючы з Андраніка II (1282-1328) Візантыя ў знешняй палітыцы пераходзіць да пасіўнай абароны. Імператарская ўлада слабела, усё большую вагу ў жыцці краіны набывала арыстакратыя на месцах, якая імкнулася да самастойнасці. Васілеўсы былі вымушаны раздаваць знаці прывілеі, каб заручыцца яе лаяльнасцю, але гэта вяло да яшчэ большага ўзмацнення апошняй. Апрача асманскай небяспекі існавала яшчэ і пагроза з боку суседніх балканскіх славянскіх дзяржаў. Свежым у памяці было і заходнееўрапейскае панаванне, якое ўсталявалася пасля чацвёртага крыжовага паходу, наступствы якога так і не ўдалося ліквідаваць да канца. Антывізантыйская агрэсія «лацінскага свету» моцна трымалася ў памяці візантыйцаў. Васілеўскам, якія шукалі саюзнікаў супраць туркаў, даводзілася гэта ўлічваць. Усе спробы царкоўнай уніі выклікалі моцнае абурэнне сярод

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

шырокіх колаў насельніцтва Візантыі, што яшчэ больш ускладніла сітуацыю ўнутры краіны.

Разам з тым, у Візантыі існавалі і празаходнія сілы, перш за ўсё сярод купцоў і феадалаў, звязаных з італьянскім гандлем. З іншага боку, прывілеі, якія даваліся імператарамі венецыянцам і генуэзцам, выклікалі моцнае незадавальненне многіх мясцовых рамеснікаў і гандляроў, якія не вытрымлівалі няроўнай канкурэнцыі.

Андранік IIIСупярэчнасці ўнутры візантыйскага грамадства часам пераасталі ў жорсткія канфлікты - аж даАндранік II грамадзянскіх войнаў. З 1320 па 1328 г. цягнулася грамадзянская вайна паміж Андранікам II і яго ўнукам Андранікам III, падчас якой узвысіўся адзін з прадстаўнікоў візантыйскай знаці Ян Кантакузін. У выніку барацьбы Андронік III вымусіў свайго дзеда адракчыся ад трона і пайсці ў манастыр, але рэальная ўлада аказалася ў руках Яна Кантакузіна.

У 1341-1355 гг. разгарнулася самая жорская грамадзянская вайна і пачалася яна з сутычкі дзвюх груповак знаці. Адна з іх згуртавалася вакол малалетняга імператара Яна V Палеалога, яго маці Ганны Савойскай і канстанцінопальскага патрыярха. Гэтая групоўка адлюстроўвала інтарэсы чыноўна-служылай знаці, перш за ўсё сталічнай. Да яе далучылася і гандлёва-рамеснае насельніцтва гарадоў, незадаволенае засіллем правінцыяльнай знаці, лідэр якой Ян Кантакузін (на той час рэгент пры малалетнім імператары) фактычна ўзяў у свае рукі кіраванне дзяржавай. Грамадзянская вайна была багатая на крывавыя і драматычныя падзеі. Варожыя бакі ўцягнулі ў міжусобную барацьбу знешнія сілы: туркаў, сербаў, балгар. У 1342 г. спробы Яна Кантакузіна ўзняць супраць Канстанцінопаля гараджан Фесалонік прывялі да паўстання ў другім па велічыні горадзе Візантыі. Знаць, якая падтрымлівала узурпатара, была выгнана з Фесалонік. У 1345 г. верх у горадзе ўзялі зілоты («заўзятыя», «зайздроснікі»). Гэтая антыарыстакратычная радыкальная групоўка складалася з чыноўнікаў, ніжэйшага духавенства, беднаты, а яе галоўнай сілай была карпарацыя маракоў. Аднак у крыніцах нічога не гаворыцца аб удзеле ў гэтым руху карпарацый рамеснікаў і гандляроў. Паўстанне зілотаў у Фесалоніках толькі знешне нагадвала камунальны рух у гарадах Заходняй Еўропы. Зілоты так і не стварылі сапраўднага самакіравання ў горадзе, таму ўлада фактычна заставалася ў руках дзяржаўных чыноўнікаў. Аслабелыя слаі гарадскога насельніцтва не здолелі супрацьстаяць засіллю буйных феадалаў. Не столькі ваенныя сілы Яна Кантакузіна, колькі слабасць і нерашучасць паўстанцаў прывялі іх да паражэння.

У 1347 г. Ян Кантакузін увайшоў у Канстанцінопаль і быў абвешчаны імператарам. Яна V ён прызначыў сваім суправіцелем і Ян Кантакузінвыдаў замуж за яго сваю дачку. Але барацьба на гэтым не спынілася. Чарговае паражэнне Кантакузіна ў вайне з генуэзцамі, яго ўступкі туркам выклікалі новы ўсплёск незадавальнення. У 1354 г. Ян V Палеалог пры падтрымцы канстанцінопальцаў прымусіў самазванага «суправіцеля» адрачыся ад улады і пайсці ў манастыр.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Турэцкая пагроза. Яшчэ з XI ст. галоўная небяспека для Візантыі на ўсходзе зыходзіла ад турэцкіх дзяржаў. Спачатку гэта быў султанат Вялікіх Сельджукідаў, а потым - Румскі (Іканійскі) султанат, які аддзяліўся ад першага. У 1242 г. манголы разграмілі сельджукскую дзяржаву ў Малой Азіі, а адроджанай неўзабаве Візантыі давялося мець справу на сваіх усходніх рубяжах з невялікімі турэцкімі княствамі (бейлікамі), якія сапернічалі паміж сабой, імкнучыся адначасова скінуць ярмо залежнасці ад мангольскіх ільханаў дынастыі Хулагуідаў.

Спачатку турэцкія княствы ў Малой Азіі не ўяўлялі сур'ёзнай небяспекі для Візантыі. У першай палове XIV ст. туркі ўчынялі ў асноўным эпізадычныя набегі на візантыйскія тэрыторыі, актыўна займаліся пірацтвам і гандлем рабамі. Але ўжо тады іх дзеянні наносілі адчувальную шкоду прыморскім раёнам Візантыі і міжземнаморскаму гандлю. Агульныя інтарэсы ў гэтым рэгіёне шэрага еўрапейскіх дзяржаў прывялі да крыжовага паходу 1343-1344 гг. супраць турэцкіх княстваў, якія размяшчаліся на ўсходнім узбярэжжы Эгейскага мора. У ім прынялі ўдзел, апрача Візантыі, Францыя, рымскі (дакладней авіньёнскі) папа, Венецыя, Неапалітанскае каралеўства, некаторыя правіцелі астравоў Эгейскага і Міжземнага мораў. Саюзнікам удалося адбіць у туркаў буйны порт Смірну (Ізмір). Ужо тады барацьба візантыйцаў і туркаў вялася пад лозунгамі рэлігійнай вайны (апошнія аб'явілі свяшчэнную вайну з няверными за іслам - газават ці джыхад).

Візантыя ў 1350Цяжкае становішча для Візантыі склалася ў першай палове XIV ст. на Балканах, дзе галоўныміСтэфан Душан яе сапернікамі выступалі Балгарыя і Сербія. Разграміўшы ў 1330 г. Балгарыю, правіцель Сербіі Стэфан Душан абвясціў сябе «царом і самаўладцам Сербіі і Раманіі», не хаваючы сваіх агрэсіўных намераў супраць Візантыі. Уцягнутыя ў міжусобіцы, балканскія дзяржавы так і не здолелі стварыць адзіны фронт супраць турэцкай пагрозы.

Першай адчула смяротную небяспеку Візантыя. Яна зыходзіла аднак не ад прыморскіх турэцкіх княстваў, сярод якіх было і некалькі даволі буйных, а ад маленькага і спачатку слабага бейліка Асманаў, які ўтварыўся на паўночным захадзе Малой Азіі. Ён не меў выхаду да мора, а на беразе праліва, які злучаў бліжэйшае Мармуровае мора з Чорным, якраз і знаходзілася сталіца Візантыі - Канстанцінопаль. У 1299 г. бей Асман абвясціў аб сваёй незалежнасці ад сельджукскіх султанаў, трон якіх у Іконіі тады быў аб'ектам барацьбы паміж правадырамі сельджукаў. Ад імя Асмана яго дынастыя і княства (бейлік) пачалі называцца Асманскімі.

Асманскі бейлік, што знаходзіўся каля паўночна-ўсходніх рубжоў Візантыі, сваю экспансіяністскую палітыку накіраваў на яе малаазіяцкія тэрыторыі. Узбярэжныя балканскія раёны, куды, галоўным чынам, рабілі набегі беі прыморскіх турэцкіх княстваў, Асмана не цікавілі. У 1326 г. туркі-асманы ўзялі Прусу (Бурсу), у 1330 г. - Нікею, у 1337 г. - Нікамедыю і выйшлі да ўсходняга ўзбярэжжа Мармуровага мора. Канстанцінопаль знаходзіўся ўжо зусім побач. Адначасова з захопам візантыйскіх уладанняў асманскія правіцелі далучалі да свайго бейліка і іншыя турэцкія княствы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Правячыя колы Візантыі часам праводзілі яўна блізарукую палітыку ў адносінах да сваіх турэцкіх суседзяў. Калі ў Візантыі ў 40-х гг. XIV ст. разгарнулася вострая барацьба за імператарскі трон, абодва варожыя бакі звярнуліся за ваеннай дапамогай да туркаў, але з розных бейлікаў. Узурпатар Ян Кантакузін прыцягнуў на свой бок асманаў, аддаўшы ў жонкі іх правадыру сваю дачку. Туркі-асманы ваявалі на баку Яна Кантакузіна ў Фракіі, удзельнічалі ў паходах супраць Сербіі і Балгарыі, якія былі на баку праціўніка узурпатара. Як узнагароду за дапамогу асманы атрымалі ў 1352 г. крэпасць Цымпе на паўвостраве Галіпалі. Так яны займелі фарпост і на другім (паўднёва-заходнім) беразе Мармуровага мора, дакладней, на ўзбярэжжы праліва Дарданелы (праз два гады яны захапілі і горад Галіпалі).
На знясіленую доўгай грамадзянскай вайной Візантыю нападалі і войскі іншыхМурад I турэцкіх бейлікаў. У 1359 г. яны ўпершыню паспрабавалі штурмаваць Канстанцінопаль, але пацярпелі няўдачу. У 1361 г. турэцкімі атрадамі быў захоплены Адрыянопаль, у наступным годзе - Філіпаль (Плоўдзіў). Асманская ж пагроза для Візантыі, здавалася, аслабела ў першыя гады праўлення Мурада I (1360-1389), занятага ўнутранымі справамі сваёй дзяржавы. Асманы тады нават страцілі свае набыткі на Галіпалійскім паўвостраве. Але і ў самой Візантыі гэта быў час міжусобіц; у барацьбу за яе трон уключыліся таксама Венецыя, Генуя; варожымі заставаліся адносіны з Балгарыяй, Сербіяй і Венгрыяй.
Між тым Мурад I умацоўваў сваю ўладу ў Асманскай дзяржаве і нават прыняў тытул султана. З гэтага часу асманскія правіцелі перайшлі ад эпізадычных да шырокіх і пастаянных заваяванняў візантыйскіх тэрыторый і балканскіх славянскіх краін. Галіпалійскі плацдарм Мураду I вярнулі самі візантыйцы, баючыся яго гневу. З дапамогай генуэзцаў вялікія сілы туркаў-асманаў у 1376 г. пераправіліся на Балканскі паўвостраў. Менш чым 30 гадоў спатрэбілася ім, каб захапіць амаль усе еўрапейскія ўладанні Візантыі, Сербію, Балгарыю. Мурад I заняў Адрыянопаль і Косава полепeранёс туды сваю сталіцу. У 1389 г. туркі разграмілі сербаў і баснійцаў на Косавым полі. У 1393 г. яны захапілі сталіцу Балгарыі - горад Тырнава, у наступным годзе ўзялі Фе- салонікі - другі па велічыні горад Візантыі. На пачатку XV ст. ад Візантыі заставаліся толькі Канстанцінопаль з прылеглай да яго тэрыторыяй ды шэраг абласцей на Пелапанесе, а таксама некаторыя астравы.
Візантыйскія імператары пачалі шукаць дапамогі ў сваіх аднаверцаў у Еўропе. У канцы 60-х гг. XIV ст. Ян V Палеалог накіраваўся ў паездку да галавы каталіцкай царквы, пагадзіўся нават прыняць каталіцтва, але чаканай падтрымкі так і не атрымаў. Больш рэальнымі былі разлікі на падтрымку караля Венгрыі, да рубяжоў якой туркі выйшлі пасля сваіх перамог на Балканах. Дапамога прыйшла толькі ў 1396 г., калі ў Еўропе нарэшце ўсвядомілі небяспеку турэцкай агрэсіі: па ініцыятыве тады яшчэ венгерскага караля Сігізмунда I супраць туркаў-асманаў быў арганізаваны крыжовы паход. У ім прынялі ўдзел каля 60 тыс. рыцараў-крыжаносцаў зБітва пад Нікапалем пяці краін: Венгрыі, Польшчы, Германіі, Чэхіі, Францыі, былі невялікія атрады рыцараў з Наліі і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

наваt Англіі. Пад балгарскім горадам Нікапалем у верасні 1396 г. крыжакі Баязід Ісышліся ў бітве з войскам султана Баязіда I Йылдырыма (Маланкавага), у складзе якога, дарэчы, біліся і 15 тыс. сербаў на чале з іх дэспатам Стэфанам Лазаравічам. У жорсткім і крывавым баі Баязід ушчэнт разграміў крыжаносцаў, забраўшы ў палон каля 10 тыс. рыцараў (амаль усім ім па загаду султана адсеклі галовы).
Нікапальская катастрофа, здавалася, паставіла крыж на лёсе Візантыі. Баязід аблажыў Канстанцінопаль і некалькі гадоў трымаў горад у блакадзе; спроба штурму ў 1400 г., аднак, была няўдалай. Выратаванне для канстанцінопальцаў прыйшло нечакана, але зусім не ад еўрапейскіх аднаверцаў, а з мусульманскага Усходу. У 1402 г. у Малую Азію ўварваліся войскі сярэднеазіяцкага заваёўніка Цімура (Тамерлана). Каля Анкары армія Баязіда была разгромлена, а сам ён трапіў у палон, дзе скончыў жыццё самагубствам. Цімур, аднак, не збіраўся ўключаць уладанні ЦімурАсманаў у сваю дзяржаву і тым больш ісці на Канстацінопаль. Разрабаваўшы Малую Азію, ён вярнуўся ў Самарканд з вялікай здабычай і многімі тысячамі палонных. А для таго, каб Асманская дзяржава больш не была небяспечнай суседкай для яго, Цімур падзяліў яе тэрыторыю паміж чатырма сынамі Баязіда. І разлік Цімура спачатку апраўдаўся - нашчадкі султана пачалі зацятую барацьбу паміж сабой. Візантыя ж атрымала перадышку і даволі ўмела выкарыстоўвала супярэчнасці паміж асманскімі правіцелямі, напрыклад, нацкаваўшы іх адзін на другога пры спробе аблогі Канстанцінопаля ў 1411 г. Але чаканая дапамога з захаду ўсё не паступала.
Сур'ёзнай перашкодай на шляху стварэння візантыйска-заходнееўрапейскага саюза была пазіцыя рымскіх пап, якія настойвалі на падпарадкаванні сабе праваслаўнай царквы. Яаан VIII Палеалог і канстанцінопальскі патрыярх пайшлі і на гэта, з'явіўшыся на Ферара-Фларэнційскі сабор, на якім вышэйшае каталіцкае духавенства і візантыйская дэлегацыя заключылі царкоўную унію. Паводле уніі 1439 г. візантыйская царква прызнавала вяршэнства рымскага папы і галоўныя каталіцкія догматы, якія былі прадметам разладу паміж праваслаўнымі і католікамі. Аднак большасць праваслаўнага насельніцтва і духавенства Візантыі, а таксама іерархі іншых праваслаўных цэркваў адмовіліся прызнаць гэтую ўнію.
Тым часам Асманская дзяржава адрадзіла былую моц. Візантыя страціла адваяваныя ў туркаў свае тэрыторыі і як раней пры Баязідзе I абавязалася выплачваць даніну султану. У 1444 г. супраць туркаў быў арганізаваны новы крыжовы паход, які ўзначаліў кароль Польшчы і Венгрыі Уладзіслаў III Ягелон. Пад Варнай крыжаносцы пацярпелі сакрушальнае паражэнне ад асманскага войска, Уладзіслаў III загінуў у баі. У 1448 г. на Косавым полі адбылася яшчэ адна бітва: на гэты раз туркі разграмілі венгерскае войска. Турэцкі султан Мехмед II пачаў рыхтавацца да ўзяцця Канстанцінопаля, які заставаўся для туркаў перашкодай паміж азіяцкай і еўрапейскай часткамі іх вялізнай дзяржавы.

**4. Падзенне Візантыі**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Грамадзянская вайна сярэдзіны XIV ст. прынесла Візантыі разбурэнне і спусташэнне. Нямала абласцей адпала назаўсёды. У дзяржаве ўсталявалася дэцэнтралізацыя: узвысіліся мясцовыя правіцелі, якія мала лічыліся з імператарскай уладай, ды і самі васілеўсы садзейнічалі раздробленасці, раздаючы ў кіраванне сваякам тэрыторыі ў якасці ўдзелаў.

Імператар Ян V Палеалог вымушаны быў прызнаць сябе васалам прызнаў сябе васалам Асманаў. Ён, а затым і нас- тупныя імператары - Мануіл II (1391-1425), Ян VIII (1425-1448) асноўныя свае надзеі на вyратаванне ад турэцкага заваявання ўскладалі на дапамогу з Захаду. Адказамі на іх заклікі былі крыжовыя Нікапальскі і Варненскі паходы 1396 г. і 1444 г., але яны скончыліся няўдачамі. Царкоўная ж унія, заключаная Янам VIII, яшчэ больш распаліла канфлікты ў візантыйскім грамадстве. Між тым тэрыторыя Візантыйскай імперыі няўхільна скарачалася. Туркі-асманы захоплівалі адну частку за другой. У 1430 г. яны ў другі раз узялі Фесалонікі, якая выйшла з-пад турэцкага панавання толькі пасля разгрому Цімурам Баязіда I. Неўзабаве заваяваныя туркамі тэрыторыі замкнулі кола вакол Канстанцінопаля.

Візантыя 1453У смяротную схватку з турэцкім султанам давялося ўступіць апошняму імператару Візантыі Канстанціну XI Палеалогу (1449-1453). Сімвалічна, што ён насіў тое ж імя, што і заснавальнік Канстанцінопаля - рымскі імператар Канстанцін I Вялікі. Зрэшты, не менш сімвалічным было і супадзенне імён заснавальніка Рыма - Ромула і апошняга заходнерымскага імператара - Ромула Аўгуста (празванага з-за малалецтва «Аўгустулам» - «Аўгусцінчыкам»). Для Мехмеда II узяцце Канстанцінопаля ўяўлялася не проста перамогай над слабым праціўнікам, гэта было здзяйсненне адной з галоўных мэт джыхаду (шматвяковай «свяшчэннай вайны з няверными»), да якой імкнуліся яшчэ першыя халіфы заснаванай пракам Мухамедам дзяржавы мусульман.Канстанцін XI

Мехмед II рыхтаваўся да ўзяцця Канстанцінопаля доўга і настойліва. У 1451 г. на поўнач ад горада ў самым вузкім месцы праліва Басфор на яго еўрапейскім беразе туркі пабудавалі крэпасць Румелі-Хісар. Другая крэпасць - Анаталі-Хісар была ўзведзена насупраць - на азіяцкім беразе праліва. Канстанцінопаль такім чынам быў адрэзаны ад шляхоў з Чорнага мора. Для штурму горада Мехмед II сканцэнтраваў вялізныя сілы - 150-200 тыс. воінаў (называецца і лічба 400 тыс.). Асаблівая ўвага надавалася артылерыі і флоту. Турэцкі флот налічваў да 400 караблёў, тады як абаронцы горада мелі менш за тры дзесяткі, праўда, вывучка візантыйскіх, а таксама генуэзскіх і венецыянскіх маракоў (яны прыбылі на дапамогу на некалькіх караблях) была намнога вышэй.

Мехмед II пачаў аблогу Канстанцінопаля 6 красавіка 1453 г. (цягнулася 53 дні). Сілы абаронцаў горада былі нязмерна меншымі. Са зброяй у руках, па розных падліках, змагаліся 7-10 тыс. чалавек, з іх 3-4 тыс. італьянцаў, у асноўным наёмнікаў. І нават у гэты крытычны момант еўрапейскія дзяржавы не прыйшлі на дапамогу сваім хрысціянскім аднаверцам. Крыху дапамагалі толькі Генуя і Венецыя, для якіх падзенне Канстанцінопаля наносіла сур'ёзны ўдар іх гандлёвым інтарэсам. Але гэтай падтрымкі было яўна недастаткова.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Нягледзячы на велізарную перавагу ў сілах узяцце Канстанцінопаля аказалася цяжкай справай для туркаў. Дэмаралізуюча паўплывала на іх бліскучая перамога чатырох генуэзскіх і аднаго візантыйскага карабля над паўтары сотнямі турэцкіх караблёў каля ўваходу ў бухту Залаты Рог. Знішчыўшы мноства суднаў праціўніка, караблі з воінамі і харчаваннем прарваліся ў бухту. У турэцкім войску пачаліся хваляванні. Каб узняць дух сваіх воінаў, Мехмед II абвясціў, што аддасць ім горад на рабаванне на 3 дні.
Але рашаючую ролю адыграў неспадзяваны для канстанцінопальцаў манеўр турэцкага султана. Мехмед II вырашыў нанесці ўдар у самае слабаабароненае месца сцяны Канстанцінопаля на беразе бухты Залаты Рог. Туркі не маглі прарвацца да яго морам, бо ўваход у бухту быў перакрыты масіўнымі металічнымі ланцугамі, а ў самой бухце знаходзіліся візантыйскія і італьянскія караблі. У ноч на 22 красавіка туркі перацягнулі 80 сваіх караблёў у бухту па сушы па драўлянаму насцілу (турэцкія крыніцы прыпісваюць задумку гэтага манеўра мудрасці самога султана). Перацягванне караблёў адбывалася там, дзе знаходзілася генуэзская калонія Галата. Генуэзцы Галаты нічым не перашкодзілі гэтай пагібельнай для канстанцінопальцаў аперацыі туркаў, за што атрымалі недатыкальнасць ад султана. Завалодаўшы бухтай, туркі збудавалі плывучы мост да сцен горада.
Характэрна, што і ў момант смяротнай небяспекі сярод абаронцаў Канстанцінопаля разгарэліся спрэчкі на рэлігійнай глебеГенадзь Схаларый. Яшчэ да пачатку аблогі туды прыбыў пасланнік папы з прапановай чарговай царкоўнай уніі. Канстанцін XI згадзіўся пайсці на гэта. У адказ пачаліся беспарадкі, якія ўчынілі праціўнікі ўніі. Іх лідэр Генадзь Схаларый, якога туркі пазней прызначаць канстанцінопальскім патрыярхам, заявіў: «Не трэба нам ні дапамогі лацінян, ні яднання з імі!». Яшчэ далей пайшоў камандуючы візантыйскім флотам, які абвясціў: «Лепш бачыць пануючай у горадзе турэцкую чалму, чым лацінскую тыяру!». Візантыйскі гісторык Дука напрамкі абвінавачвае праціўнікаў царкоўнай уніі ў сабатажы выратавання Візантыйскай дзяржавы. Паводле яго словаў на абарону сцен Канстанцінопаля падняліся прыхільнікі ўніі і італьянцы.
Мехмед II у КанстанцінопаліНа світанні 29 мая 1453 г. турэцкае войска рушыла на рашаючы штурм. У разгар бою Мехмед II адправіў на сцены горада янычараў (гэтых воінаў-рабоў султана, адарваных ад іх хрысціянскіх сямей і выхаваных у ісламскім духу, было пад Канстанцінопалем каля 15 тыс.). Туркі ўварваліся ў горад. У масавай разні быў забіты і імператар Канстанцін XI. Уцалелых канстанцінопальцаў турэцкія воіны зрабілі сваімі рабамі або прадалі за выкуп. Мехмед II загадаў адсекчы галаву мёртвага імператара і выставіць на ўсеагульны агляд у цэнтры разбуранага горада. Пазней галаву апошняга імператара Візантыі змясцілі ў асобую шкляную пасудзіну, і турэцкі султан пасылаў яе іншым правіцелям мусульманскага свету, каб наглядна прадэманстраваць трыумф ісламу.
Неўзабаве туркі захапілі апошнія рэшткі візантыйскіх уладанняў, у тым ліку і тыя тэрыторыі, населеныя грэкамі, якія не ўвайшлі ў адроджаную пасля 1261 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

імперыю. Гэта азначала крушэнне буйнейшага цэнтра хрысціянскай цывілізацыі на ўсходзе Еўропы. Паў «другі» Рым. Мехмед II перайменаваў Канстанцінопаль у Стамбул і зрабіў яго сталіцай Асманскай дзяржавы. У сваю тытулатуру султан уключыў словы «імператар Рыма». У турэцкай прапагандзе з'явіўся лозунг «Стамбул - трэці Рым». У пэўнай ступені супрацьвагай яму стаў лозунг расійскіх самаўладцаў: «Масква - трэці Рым». Характэрна, што ніводная з заходніх дзяржаў не выказвала прэтэнзій на абвяшчэнне сваёй сталіцы «трэцім» Рымам. Магчыма, пры гэтым улічвалася гаротная доля як «першага», так і «другога» Рыма.
Хрысціянскі свет не проста страціў тэрыторыі і людзей. З гэтага часу турэцкая пагроза на некалькі стагоддзяў навісла над Еўропай. Турэцкае пытанне зрабілася адным з галоўных у еўрапейскіх міжнародных адносінах. Без яго ўліку амаль ніводная з дзяржаў Еўропы не магла будаваць сваю знешнюю палітыку. Уцягнутыя ў канфлікты па- між сабой найбольш моцныя еўрапейскія дзяржавы са спазненнем ус- вядомілі ўсю трагічнасць падзей на берагах Басфора.

## Тэма 6: Хрысціянскія краіны Пірэнейскага паўвострава ў познім Сярэднявеччы.

1. *Сацыяльна-эканамічнае развіццё краін Пірэнейскага паўвострава*
2. *Палітычнае развіццё Кастыліі.*
3. *Палітычнае развіццё Арагона.*
4. *Палітычнае развіццё Партугаліі.*

### 1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё краін Пірэнейскага паўвострава

***Сацыяльная структура***

| | **Кастылія** | **Арагон** | **Партугалія** |
|---|---|---|---|
| | | | |
| Феадалы | Духавенства | Духавенства | Духавенства |
| | Гранды (рыкас омбрэс і інфанты) | Рыкас омбрэс (каміты і віконты) | Рыку омэн |
| | | вальвасары | |
| | Ідальгас, кабальерас | ідальгас | Фідалгу, кавалейру |
| | | | |
| Падатныя станы | Гараджане | Гараджане | Гараджане |
| | | | |
| | Сяляне (салар'ега) | Сяляне (васалы сеньёраў, | Сяляне (кавалейру-віланы |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | рэменсы) | і пеоны) |

Такая сацыяльная структура ўплывае на сістэму саслоўнага прадстаўніцтва

*Картэсы*

| **Кастылія (1188)** | **Арагон (1274)** | **Партугалія (1254)** |
|---|---|---|
| Духавенства | Духавенства | Духавенства |
| Рыкас омбрэс | Рыкас омбрэс | Фідалгу |
| Прадстаўнікі кансеха | Вальвасары і ідальгас | Гараджане |
| Прадстаўнікі бегетрый | Гараджане | |

***Эканамічныя працэсы ў Кастыліі***

14-15 ст. – паступовае аслабленне пазіцый БЕГЕТРЫЙ, але разам з тым аслабленне даменіяльнай гаспадаркі, узмацненне парцэллы, права салар’ега на пераход ад сеньёра да сеньёра

Новая рыса ў с/г – развіццё танкаруннай авечкагадоўлі. стварэнне МЕСТЫ, скарачэнне рлі збожжавай гаспадаркі

АЛЕ арыентацыя на экспарт сыравіны – воўны ў Італію носіць дэструктыўны характар, бо не развіваецца сукнаробства, замаруджваецца прыход мануфактурнай вытворчасці.

Агульнанацыянальнага рынку не склалася

***Эканамічныя працэсы ў Арагоне***

Рэлікт феадалізму – захаванне найбольш жорсткіх форм эксплуатацыі сялянства “ДУРНЫЯ ЗВЫЧАІ” – кугусія, арсіна і г.д.

Гарады не развіты, за выключэннем Барселоны, рамесная вытворчасць слабая. Гандаль у руках замежных купцоў.

***Эканамічныя працэсы ў Партугаліі***

У адрозненне ад Кастыліі, дзе адбываецца закрыццё феадальнага саслоўя, і Арагона, дзе яно ўжо было закрыта, у Партугаліі феадальны стан папаўняецца разбагацеўшымі сялянамі (кавалейру –віланы) і гараджанамі (кавалейру - купцы).

Разарэнне фідалгу, пераход зямель да кавалейру-віланаў, развіццё больш прыбытковых оўцаў, вываз воўны ў Фландрыю. Ужыццё працы наёмных сялян самімі сялянамі.

Вялікую ролю адыгрываў гандаль, тут у адрознення ад Кастыліі і Арагона склаўся нацыянальны рынак.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Прынцыпова новы момант – гаспадарчае асваенне калоній.

1. Мадэйра – забяспечыла Партугалію збожжам
2. Там жа – плантацыі цукровага трыснёга
3. Гандаль рабамі.

**Высновы:**

